153. МОСКВА 19, УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИНСТИТУТ СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА И ПРАВА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 131 (5505)
СЕРАДА
10
ЧЭРВЕНЯ
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

АБ УЧОЦЕ ПАСЕЎНЫХ ПЛОШЧАЎ У 1936 г.—ПАСТАНОВА СНК БССР І ЦК КП(б)Б.

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫЯ — ВЫШЭЙ СЦЯГ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА. НАПЯРЭДАДНІ ЎБОРКІ.

І. БРЫХНІЧОЎ, І. СУРТА — ГЕОРГ СТЭФЕНСОН. ВАЎЧОК — ЗАМАЦАВАЦЬ ЗА САБОЙ ПЕРАДАВОЕ МЕСЦА. С. СЯМАШКА — ДОМ СОЦКУЛЬТУРЫ. РОТМІЛЬ — ЖАНГЛЁРЫ ЛІЧБАМІ.

ВОПЫТ ПАРТЫЙНАЙ ПРАПАГАНДЫ БОЛЬШЭВІКОЎ ГОРАДА ЛЕНІНА.

ПРАЦОЎНЫЯ БССР АБМЯРКОЎВАЮЦЬ ЗАКОНАПРАЕКТ АБ ЗАБАРОНЕ АБОРТАЎ І ДАПАМОЗЕ РОЖАНІЦАМ.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ РЫХТАВАЦЦА ДА ЎБОРКІ ЎРАДЖАЮ.

АЛЕКСЕЙ СТАХАНАЎ ПРЫНЯТ У РАДЫ ВКП(б).

КАПАБЛАНКА І БАТВІНІК — ПЕРАМОЖНЫ ТРЭЦЯГА МАСКОЎСКАГА МІЖНАРОДНАГА ШАХМАТНАГА ТУРНІРУ.

ЗА РУБЯЖОМ:

ГРАНДЫЁЗНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ НАРОДНАГА ФРОНТА Ў ПАРЫЖЫ.

НОВЫЯ РАССТРЭЛЫ БЕСПРАЦОЎНЫХ У ПОЛЬШЧЫ.

ВЫШЭЙ СЦЯГ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

Гэтымі днямі прадстаўнікі трох буйнейшых прамысловых цэнтраў БССР — Менска, Гомеля і Віцебска, ад імя партыйных, совецкіх, профсаюзных арганізацый, ад імя стахановаў, рабочых калектываў, інжынерна-тэхнічных работнікаў падпісалі дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва. Пачалося спаборніцтва трох гарадоў на лепшае выкананне пырэктыў снежаньскага пленума ЦК ВКП(б) 1935 года і студзеньскага пленума ЦК КП(б)Б, на датэрміновае выкананне вытворчых планаў 1936 года.

Цэнтральны пункт дагавору трох гарадоў аб тым, **каб не пазней 10 снежня 1936 года выканаць якасныя і колькасныя паказальнікі гадавога плана, квартальныя планы выконваць 20 чысла апошняга месяца квартала, а поўгадовы план — да 15—20 чэрвеня**, выражае імкненне шырокіх мас стахановаў не толькі паказаных гарадоў, але і ўсёй прамысловасці БССР.

Гэты пункт, як і ўсе астатнія пункты дагавору, базуецца на нашых неабмежаваных магчымасцях, якія нясуць шырокае разгортванне стахановскага руху, на велізарнейшым энтузіязме рабочых мас.

Задача заключаецца ў тым, каб здолець поўнасцю выкарыстаць гэтыя магчымасці, здолець па-большэвіцку ўзначаліць стахановскі рух, штодзенна арганізоўваць яго, разгарнуць на ўвесь яго размах, на ўсю магутнасць. Трэба выкарыстаць велізарнейшы творчы энтузіязм стахановаў, рабочых, якія рвуцца да новых вышынь прадукцыйнасці працы.

Партыя, сакрушаючы супраціўленне класава-варожых і кансерватыўных элементаў, дабілася буйнейшых поспехаў у развіцці соцыялістычнага спаборніцтва і яго вышэйшай формы — стахановскага руху. Няма цяпер ні адной галіны прамысловасці і сельскай гаспадаркі куды-б ні пранік стахановскі рух. Стахановы на нашых прадпрыемствах цяпер лічаць ужо не дзесяткамі і не сотнямі. Гэты рух ахапляе ўсё больш і больш шырокія масы рабочых.

Але гэтыя дасягненні не даюць ні малейшай падставы для той самасупакоенасці, якая за апошні час стала праяўляцца на радзе прадпрыемстваў, у некаторых партыйных арганізацыях.

Многія кіраўнікі не разумеюць, што рост колькасці стахановаў ні ў якім разе не азначае, што ўжо зняты ўсякія перашкоды на шляху далейшага развіцця стахановскага руху.

У рэзультаце на многіх прадпрыемствах пусцілі стахановскі рух на самацёк, аслабілі барацьбу з сабатажнікамі. Аб гэтым гаворыць матэрыял з менскай шчотачнай фабрыкі, які сёння друкуецца ў «Звяздзе», з рэчыцкіх, барысаўскіх і іншых прадпрыемстваў.

Іменна адсутнасцю барацьбы за далейшую арганізацыю стахановскага руху тлумачыцца той факт, што прамысловасць Гомеля, Віцебска і Барысава не выканала сваіх майскіх вытворчых планаў.

Прамысловасць БССР працуе па новых нормах. Гэтыя нормы выражаюць новы ўздым прадукцыйнасці працы на аснове дасягненняў стахановскага руху. Новыя нормы быстра асвойваюцца не толькі стахановцамі. За час іх асваення ў нас выраслі сотні стахановаў, якія на многа перакрываюць гэтыя нормы.

Але ёсць у нас значная група рабочых, якія яшчэ не асвоілі гэтых норм. Ёсць яны і ў швейнай, і ў металапрамысловасці, і на тарфяных, і цагельных заводах. Гэтыя людзі таксама хочуць працаваць па-стахановску, але яны патрабуюць дапамогі.

Поспехі ў галіне разгортвання стахановскага руху звязаны ў першую чаргу з поўным асваеннем усімі без выключэння рабочымі новых норм, з перавыкананнем гэтых норм. Інакш можа здарыцца такое становішча, калі дзесяткі лепшых стахановаў будуць намнога перавыконваць свае нормы, а прадпрыемства ўсё-ж свайго плана не будзе выконваць. Такія факты ёсць у нас і зараз.

Патрабуецца сістэматычная арганізатарская работа дырэктароў прадпрыемстваў, інжынерна-тэхнічных работнікаў, прафсаюзаў па арганізацыі рабочага месца, па перадачы лепшага вопыту стахановаў усім рабочым. Трэба безупынна вывучаць і знішчаць прычыны, якія перашкаджаюць таму ці іншаму рабочаму асвоіць новую норму, працаваць па-стахановску. Трэба настойліва і рашуча выкрываць сабатажнікаў стахановскага руху.

У дагаворы асабліва падрабязна ўказаны мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне тэхнічнага і агульнакультурнага ўзроўню рабочых, на паляпшэнне культурна-бытавога абслугоўвання. Гэта зусім зразумела. Гэтыя пытанні адыгрываюць рашаючую ролю ў далейшым разгортванні стахановскага руху.

Усякія размовы аб стахановскім руху без штодзенных клопатаў аб матэрыяльных і культурна-бытавых умовах стахановаў ёсць пустая, нікому непатрэбная балбатня.

У маі прамысловасць БССР працавала нездавальняюча. План усёй прамысловасцю выканан, праўда на 102,1 проц., але Гомель выканаў план толькі на 97,7 проц., Орша — на 98,4 проц. і Віцебск — на 99 проц. Значыць, у чэрвені прамысловасць павінна працаваць такімі тэмпамі, каб да 15—20 чэрвеня не толькі выканаць чэрвеньскую праграму, але і перакрыць недавыкананне ў маі.

Дагавор трох гарадоў павінен з'явіцца магутным сродкам новага ўздыму спаборніцтва паміж заводамі, цэхамі, паміж асобнымі рабочымі не толькі спаборнічаючых гарадоў, але і ва ўсёй прамысловасці БССР. Гэта можа быць дасягнута толькі тады, калі кожны рабочы будзе добра ведаць усе абавязацельствы, якія выцякаюць з дагавору, калі кіраўнікі партыйных арганізацый, фабрык і заводаў вакол канкрэтных пунктаў дагавору мабілізуюць актыўнасць рабочых, стахановаў і ператвораць яго ў сапраўдны магутны вагар далейшага разгортвання і ўздыму стахановскага руху.

Адкрылася Полацкая акруговая партканферэнцыя

ПОЛАЦК. (Ад уласнага карэспандэнта). Учора ў 7 гадзін вечара адкрылася першая акруговая партыйная канферэнцыя Полацкай акругі. Канферэнцыю адкрывае сакратар аргбюро ЦК КП(б)Б па Полацкай акрузе тав. **Ліхачоў.**

— Наша партыйная канферэнцыя, — гаворыць тав. Ліхачоў у сваім уступным слове, — адкрываецца пасля яшчэ адной новай гістарычнай перамогі нашай вялікай радзімы — запвяржэння сталінскай канстытуцыі, самай дэмакратычнай канстытуцыі ў свеце. І першае слова большэвікоў-пагранічнікаў накіравана да нашага вялікага **Сталіна**, прывёўшага нас да гістарычных перамог соцыялізма.

У дзелавы прэзідыум канферэнцыі выбіраюцца тт. Гікало, Валковіч, Убаравіч, сакратары аргбюро ЦК КП(б)Б тт. Ліхачоў і Вайновіч і інш.

Доўга незмаўкаючымі апладысментамі суправаджаецца чытка прывітальнай тэлеграмы таварышу **Сталіну**, якога большэвікі Полацкай акругі запаўняюць у сваёй бязмежнай адданасці справе Леніна — Сталіна.

Прывітальная тэлеграма пасылаецца ЦК КП(б)Б тав. **Гікало.**

Полацкую партканферэнцыю вітаюць стахановцы Полаччыны.

У першы дзень канферэнцыі з вялікім справаздачным дакладам аргбюро выступіў тав. Ліхачоў. У парадку дня канферэнцыі — даклад сакратара аргбюро аб ходзе абмену партдакументаў, выбары акругкома партыі і рэвізійнай камісіі. На канферэнцыі прысутнічаюць 230 дэлегатаў.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

ПРАЗ МЕНСК ПРАСЛЕДАВАЛА УРНА З ПРАХАМ ТАВ. ШАУМЯНА

Учора ў 22 гадзіны 32 мінуты з заграніцы праз Негарэлае праследавала ў СССР урна з прахам начальніка аўтабронетанкавых войск Ленінградскай ваеннай акругі тав. Шаумяна Сурэна Сцепанавіча.

На станцыі Негарэлае была выстраена ганаровая варта з часцей Менскага гарнізона. Калі поезд стаў падыходзіць да перона, аркестр выканаў жалобны марш.

У Менску на вакзал адразу апошні доўг доблеснаму байцу Чырвонай арміі, вернаму сыну партыі прышлі члены бюро ЦК КП(б)Б і ўрада БССР на чале з тав. Гікало, а таксама начальнік менскага гарнізона камдыў т. Сердзіч і начальніцкі састаў часцей гарнізона. На пероне была выстаўлена ганаровая варта ў складзе двух рот.

Ад ЦК КП(б)Б і ўрада БССР быў усклады вянок на урну тав. Шаумяна.

У 22 гадзіны 45 мінут пад гукі жалобнага маршу поезд з урнай тав. Шаумяна адправіўся ў Маскву.

РАШЭННІ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б) НАТХНЯЮЦЬ НА НОВЫЯ ПЕРАМОГІ

СХОД МАСКОЎСКАГА ПАРТАКТЫВА

8 чэрвеня ў Вялікай зале кансерваторыі сабраўся актыў маскоўскай партыйнай арганізацыі для абмеркавання вынікаў чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б). Прысутнічала звыш 2.500 чалавек, у тым ліку прыбыўшыя з вобласці сакратары райкомаў партыі, сакратары парткомаў, прадпрыемстваў і інш.

З'яўленне ў прэзідыуме тт. **Хрушчова, Будзённага, Когана, Булганіна, Філатава**, членаў бюро МК і МГК ВКП(б) актыў вітаў бурнымі, доўгімі апладысментамі.

Сход адкрыла сакратар маскоўскага гарадскога камітэта ВКП(б) тав. **Коган**, якая прадаставіла слова для даклада тав. **Н. С. Хрушчову.**

Спатканы бурнымі апладысментамі, т. Хрушчоў у вялікім цікавым дакладзе прызвёў рашэнні чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б), якія знамянуюць гістарычныя перамогі соцыялізма, і паставіў перад маскоўскай арганізацыяй задачы па ажыццяўленню рашэнняў пленума.

З выключнай увагай выслухаў актыў пераказ праекту новай канстытуцыі Саюза ССР, распрацаванай пад непасрэдным кіраўніцтвам т. **Сталіна.** Сход вітаў тварца новай канстытуцыі, натхніцеля перамог краіны соцыялізма, любімага праводыра і настаўніка — т. **Сталіна** бурнымі, доўга незмаўкаючымі авацыямі.

Тав. Хрушчоў заклікаў усю маскоўскую арганізацыю да ўпартай большэвіцкай работы па выкананню рашэнняў чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б). Перад большэвікамі Маскоўскай вобласці стаяць задачы — добра падрыхтавацца да ўборкі ўраджаю, убрать яго своечасова, арганізаваць малацьбу, закончыць у тэрмін хлебапастаўкі дзяржаве, забяспечыць высокі працадзень калгасніка.

Маскоўская арганізацыя, згуртаваная вакол сталінскага Цэнтральнага камітэта ВКП(б), адданая свайму правадыру тав. **Сталіну**, з гонарам справяцца з задачамі, якія ўскладаюцца на яе рашэннямі пленума ЦК партыі.

Усе прысутныя гарачымі доўгімі апладысментамі далучаюцца да слоў маскоўскіх большэвікоў.

Пасля даклада тав. Хрушчова пачаліся спрэчкі. У спрэчках выступілі тт. Зубенка (сакратар парткома аўтазавода імя Сталіна), Гурын (сакратар ногінскага райкома ВКП(б) і Бабушкін (сакратар парткома завода ПАГІ).

Выступаўшыя аднадушна адабралі гістарычныя рашэнні пленума. Уся краіна з вялікай радасцю сустракае новую сталінскую канстытуцыю, якая ўвойдзе ў гісторыю чалавецтва, як ярчэйшая старонка барацьбы за соцыялізм, за комунізм.

— Рашэнні пленума, — заяўляюць таварышы, — мабілізуюць усю партыйную арганізацыю на барацьбу з малейшымі спробамі падрыўной работы з боку астаткаў трацкісцка-зіноўеўскага ахвосця супроць партыі, супроць народу.

З велізарным натхненнем, пад нясцынныя авацыі, воклічы «ура», «Няхай жыве вялікі **Сталін**», «Натхніцелю перамог соцыялізма тав. **Сталіну** — ура» маскоўскія большэвікі паслалі прывітанне вялікаму правадыру і настаўніку таварышу **Сталіну.**

9 чэрвеня на сходзе партактыва — працяг спрэчак па дакладу тав. Хрушчова.

ПАВЫШАЦЬ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ

З вялікай радасцю байцы лагернага збору менскай фабрыкі «Кастрычнік» сустрэлі гістарычнае рашэнне пленума ЦК ВКП(б). На адкрытым партыйным сходзе прысутнічалі ўсе рабочыя і работніцы, якія знаходзяцца на адпачынку ў лагеры. З вялікай увагай усе слухалі даклад аб рашэннях пленума. Часта даклад перарываецца бурнымі апладысментамі ў гонар любімага праводыра сусветнага пролетарыята таварыша **СТАЛІНА.** Прэзідыум атрымлівае шмат запісак ад жадаючых выступіць. У гарачых выступленнях рабочыя вітаюць рашэнне пленума, гавораць аб цудоўным, вясёлым, культурным жыцці.

Старая работніца фабрыкі, тав. **Гурыновіч** адзначыла, што становішча жанчын у былой царскай Расіі і зараз у капіталістычных краінах надзвычай цяжкое, а ў нас, у Совецкім Саюзе, жанчыны поўнаправныя гаспадары нашай краіны.

Рабочы тав. **Бурштын** у сваім выступленні спыніўся на жыцці моладзі раней і зараз. Ён у лагеры адпачывае разам са сваім 20-гадовым сынам, ён адчувае сябе таксама маладым.

Рабочыя ў адказ на рашэнне пленума абавязаліся яшчэ больш вывучыць і асвоіць тэхніку ваеннай справы. Група байцоў і камандзіраў (10 чалавек) спала ў процігазах 7 гадзін. Гэтыя яны яшчэ раз даказалі сваю гатоўнасць абараняць слаўную радзіму і выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва ўсіх астатніх рабочых.

Рабочыя ў сваіх выступленнях адзначылі, што найвялікшыя перамогі абавязваюць кожнага большэвіка—партыйнага і беспартыйнага вышэй узняць сваю рэвалюцыйную пільнасць.

ФРЫД І ХАЗАН.

ШЧАСЛІВАЕ ЖЫЦЦЁ

МЕНСК. Аўтатары фабрыкі «**Комунарка**» тт. **Мядзведзева** і **Новікаў** азнаёмілі рабочых і інжынерна-тэхнічны персанал з рашэннем чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б).

Рабочыя віталі рашэнне пленума і абавязаліся працаваць так, як патрабуе сталінскі ЦК.

Рабочы механічнага цэха тав. Шчуцкі сказаў: рашэнне пленума ёсць вынік велізарнейшых перамог у будаўніцтве соцыялізма ў нашай краіне пад кіраўніцтвам правадыра сусветнага пролетарыята таварыша **СТАЛІНА.**

Работніца мякка-шакаладнага цэха тав. Гуль у сваім выступленні адзначыла, што ў краіне Совецкіх з дня ў дзень паляпшаецца становішча працоўных, жыць стала весела, уводзіцца самая шырокая дэмакратыя. А ў капіталістычных краінах усё больш і больш расце беспрацоўе і пагаршаецца становішча працоўных.

НОВАЯ ХВАЛЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

БАБРУЙСК. З вялікім уздымам на прадпрыемствах і ў калгасах працягваецца абмеркаванне рашэння пленума ЦК ВКП(б). Прапоўныя аднадушна ўхваляюць і вітаюць рашэнне пленума ЦК ВКП(б).

Рабочыя рамонтна-механічнага завода імя Варашылава ў адказ на рашэнне пленума абавязаліся высокаякасна і своечасова выканаць заказы на рамонт сельскагаспадарчага інвентару. У падпэфным калгасе абсталяваць узорную кузню.

РАШЭННЕ ПЛЕНУМА— ПРАГРАМА РАБОТЫ

ОРША. У калгасе «**Чырвоныя Яромкавічы**» працуюць курсы ільнотрапальшчыц на машыне Антонава, якімі кіруе ордэнаносец тав. Ражкоў. На курсах займаецца 19 чалавек, з іх 17 жанчын. Лекцыі чытае выкладчык горацкага сельгасінстытута Маёраў.

7 чэрвеня на курсах прапрацаваны рашэнні чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б) аб уборцы і ўраджаю і сельскагаспадарчых загатоўках.

Рашэнні сталінскага Цэнтральнага камітэта з'яўляюцца праграмай работы для ўсіх калгаснікаў — заявілі ў сваіх выступленнях курсанты. Яны абавязаліся правесці перабленне ільну за 8 дзён, абмалот — за 6—8 дзён, падняць лён са спелітчаў за 10 дзён і апрацаваць яго за 10—14 дзён. Ільновалакно будзе здавацца дзяржаве не ніжэй 12 нумара.

Аб учоце пасеўных плошчаў у 1936 г.

ПАСТАНОВА СНК БССР І ЦК КП(б)Б

У мэтах падвядзення вынікаў пасеўнай кампаніі вясны першага стахановскага года і ўстанаўлення дасканалых размераў пасеўных плошчаў у 1936 г. Совет Народных Камісараў і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Абавязаць кіраўніцтва народнагаспадарчага ўчоту БССР і яго раённую і ўчастковую інспектуру на мясцах, у адпаведнасці з праграмай ЦУНХУ Дзяржплана СССР, на падставе заключнай справаздачы соўгасаў, ОРСаў, гаспадарак дзяржаваперацыйных устаноў і арганізацый, калгасаў, а таксама сельсоветаў па пасевах індывідуальнага карыстання (калгаснікаў, аднаасобнікаў, рабочых, служачых і інш. насельніцтва) устанавіць дакладны размер пасеўнай плошчы яравых пасеваў 1936 г. і плошчы азімых пасеваў восені 1935 г. у сельсавецкім і раённым разрэзе.

2. Устанавіць тэрмін пачатку складання заключных справаздач аб пасеўных плошчах азімых і яравых ва ўсіх катэгорыях гаспадарак і сельсоветах з 15 чэрвеня па 1 ліпеня 1936 г. і прадстаўлення іх органам Наргасучота на мясцах не пазней як праз 5 дзён пасля сканчэння сяўбы яравых.

3. Абавязаць дырэктароў дзяржаўных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў (соўгасаў, ОРСаў і г. д.), старшынь калгасаў, кіраўнікоў устаноў і арганізацый, маючых пасевы, і старшынь сельсоветаў, вылучыць асоб, адказных за ўчот пасеўных плошчаў і складанне заключных справаздач, якім у вызначаны час з'явіцца ў райінспектуру нарагасучота і прайсці інструктаж па запаўненню заключных справаздач аб пасевах.

4. Абавязаць Наркамзем, Упоўнаркомсоўгасаў, Упоўнаркамлес і іншыя наркаматы, ведамствы і арганізацыі даць падпарадкаваным ім гаспадаркам, якія маюць пасеўныя плошчы, указанне аб прадстаўленні па ўстаноўленай форме і ў тэрміны, указаныя ў п. 2 гэтай пастановы, органам народнагаспадарчага ўчоту на мясцах заключнай справаздачы аб пасеўных плошчах азімых і яравых, усклаўшы адказнасць за правільнасць і своечасовасць даных на кіраўнікоў і рахунковых работнікаў адпаведных гаспадарак, а па пасевах індывідуальнага карыстання — на старшынь сельсоветаў.

У выпадках, калі наяўны склад упаўнаважаных сельсавета не забяспечвае правядзення ўчоту, старшыні сельсоветаў павінны іх замяніць, па ўзгадненню з РВК, найбольш пісьменнымі і палітычна праверанымі работнікамі з сельскага актыва.

5. Абавязаць РВК і сельсоветы абгаварыць заключныя справаздачы на прэзідыумах райвыканкомаў і сельсоветаў з пункту гледжання паўнаты ахопу пасеўнай плошчы і праверкі выканання дзяржаўнага плана сяўбы наогул і ў прыватнасці пасеву гатунковым насеннем яравых збожжавых культур, сяўбы кармовых культур і канюшыны ў асаблівасці. У мэтах грамадскай праверкі правільнасці даных аб пасеўных плошчах індывідуальнага карыстання абавязаць РВК і сельсоветы абгаварыць вынікі заключных справаздач на шырокіх сходах працоўных аднаасобнікаў і калгаснікаў.

6. Папярэдзіць дырэктароў соўгасаў, ОРСаў, леспрамгасаў, старшынь калгасаў, кіраўнікоў дзяржаўных, каперацыйных устаноў і арганізацый, маючых пасеўныя плошчы, а таксама старшынь сельсоветаў, што яны нясуць персанальную адказнасць за своечасовае прадстаўленне і правільнасць даных аб пасеўных плошчах іх гаспадарак.

7. Даручыць органам народнагаспадарчага ўчоту ў тых выпадках, калі праверкай асобных аб'ектаў (калгасаў, устаноў, арганізацый, асобных пунктаў, сельсоветаў у цэлым) будзе выяўлена заблытанасць становішча землекарыстання або ўчоту пасеўных плошчаў, якая не дае магчымасці правільна вызначыць размеры пасеўных плошчаў,—патрабаваць ад райвыканкомаў правядзення выбарачных інструментальных абмераў. Указаныя абмеры павінны быць забяспечаны райвыканкомамі неабходным інструментарыем, кадрамі і належным арганізацыйна-палітычным кіраўніцтвам, з аднясеннем выдаткаў па абмеру пасеваў калгасна-сялянскага сектара на райвыканкомы, а на пасевах соўгасаў і ўстаноў—на кошт апошніх.

8. Лічыць, што прадстаўляемыя даныя аб пасеўных плошчах павінны грунтавацца па актах прыёмкі работ у натуры ў калгасе старшынёй калгаса, у соўгасах—старшымі агранамамі і кіраўнікамі аддзяленняў, згодна пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 20 лютага 1936 г «Аб веснавой сяўбе».

9. Устанавіць, што асобы, не прадставіўшыя ва ўстаноўлены тэрмін заключных справаздач, а таксама прадставіўшыя няправільныя даныя аб размерах фактычна засеянай плошчы яравых 1936 г., плошчы азімых па сяўбе ўвосень 1935 г. (за вылікам гібелі, згодна актаў Дзяржстраха) і плошчы шматгадовых траў пасеву мінулых гадоў,—прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці.

Вынікі ўчоту размераў пасеўных плошчаў 1936 г. па раёнах і БССР заслухаць на пасяджэнні СНК БССР.

НАПЯРЭДАДНІ ЎБОРКІ

Апублікаваная некалькі дзён таму назад пастанова пленума Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) «Аб уборцы ўраджаю і сельскагаспадарчых загатоўках» дае разгорнутую праграму падрыхтоўкі і правядзення ўборкі і сельскагаспадарчых загатовак.

Партыя і совецкі ўрад аказалі сёлета велізарную дапамогу калгасам трактарамі і сельскагаспадарчымі машынамі. У часе веснавой сяўбы на калгасных палях БССР працавала звыш 4.000 трактараў. Гэта адыграла рашаючую ролю ў паспяховым правядзенні сяўбы.

І ў часе ўборачнай кампаніі машыны будуць адыгрываць выключную ролю. Сёлета ўпяршыню на калгасных палях БССР будуць працаваць 120 камбайнаў. Мы абавязаны забяспечыць выкананне і перавыкананне плана ўборкі камбайнамі.

14.847 жнярак і лабаграек, трактарныя і конныя снопавязалкі будуць працаваць на ўборцы зерневых. 64,5 проц. усёй плошчы зерневых, 14,8 проц. усёй плошчы ільну сёлета будзе ўбрана машынамі. На перабленні ільну будуць працаваць 80% шыроказахватных ільноперабілак «ВНІІЛ-5».

Механізацыя ўборачных работ ускладае асаблівую адказнасць на партыйныя, совецкія, зямельныя органы, на машынатрактарныя станцыі за поўнае скарыстанне ўсіх уборачных машын. Рамонт уборачных машын і, галоўнае, падрыхтоўка кадраў для работы на гэтых машынах — неадкладная задача дня. Кадры, аўладаўшыя тэхнікай, будуць рашаць поспех уборачнай.

У БССР разгорнута шырокая сетка курсаў падрыхтоўкі механізатарскіх кадраў сельскай гаспадаркі. Выпушчана ўжо 6.965 трактарыстаў, 978 ільноперабільшчыкаў «ВНІІЛ-5», 90 інструктароў ільноперабільных машын. Працуюць курсы камбайнераў, дзе навучаюцца 217 камбайнераў, 205 памочнікаў камбайнераў, 20 механікаў па камбайнах, 980 машыністаў ільноперабільных машын, 629 машыністаў складаных малатарань, 227 трактарных механікаў, 460 брыгадзіраў трактарных брыгад займаюцца на курсах. У сельскую гаспадарку Совецкай Беларусі ўліваецца магутны атрад людзей, аўладаўшых навейшай складанай тэхнікай соцыялістычнага земляробства.

Але справа не абмяжоўваецца толькі гэтымі курсамі. Рад людзей павінны быць падрыхтаваны непасрэдна на месцах. А з гэтым справа абстаіць далёка не ўсюды добра. Быхаўская МТС (дырэктар тав. **Даніловіч**) павінна падрыхтаваць 15 машыністаў складаных малатарань, Мазырская МТС (дырэктар тав. **Малашонак**) — 12, Магілеўская МТС (дырэктар тав. **Ваньчук**) — 15. Але гэта справа ў іх фактычна зрываецца. Праз кароткатэрміновыя курсы масавых кваліфікацый (снопавязальшчыкі, работнікі на жнярках, вагаўшчыкі, барабаншчыкі малатарань, ільномяльшчыкі і інш.) павінна быць прапушчана 22 тысячы чалавек. Курсы павінны працаваць у чэрвені і ліпені месяцах. Між тым, у радзе раёнаў не разгорнута падрыхтоўка да гэтых курсаў.

Падрыхтоўка кадраў для ўборачнай павінна заняць зараз рашаючае месца ў рабоце партыйных, совецкіх, зямельных органаў. Справа не толькі ў падрыхтоўцы кадраў, але і ў стварэнні гэтым кадрам адпаведных умоў. Пытанні культурна-бытавога абслугоўвання камбайнераў, трактарыстаў, ільноперабільшчыкаў, машыністаў і т. д., пытанні палітмасавай работы сярод гэтых людзей маюць выключнае вялікае значэнне.

Велізарная ўвага ў пастанове пленума ЦК ВКП(б) звернута на барацьбу са стратамі ўраджаю пры ўборцы і хаванні збожжа. Пленум абавязаў да 1 жніўня скончыць будаўніцтва крытых навесаў і сушыльняў у калгасах. Між тым, справа з будаўніцтвам ў БССР абстаіць выключна дрэнна. З 1.000 зернасушыльняў сістэмы інжынера Уварава пабудавана толькі 24 і пачата будаўніцтва 450. З 1.000 гумнаў пабудавана толькі 30. Не разгорнута яшчэ ў раёнах і падрыхтоўка зернаўлавіцеляў і іншых сродкаў барацьбы са стратамі ўраджаю.

За гэту важнейшую справу трэба ўзяцца ўжо зараз. Ужо зараз неабходна прыстасаваць зернаўлавіцелі да кожнай машыны, падрыхтаваць конныя і ручныя граблі, разгарнуць работу сярод калгаснай і соўгаснай дзетвары, старыкоў, арганізаваць іх на барацьбу са стратамі пры ўборцы, падрыхтаваць і пралэзінфектаваць збожжахавальнікі.

Асаблівае значэнне для БССР мае своечасовая і высокаякасная ўборка ільну. 14,8 проц. усёй плошчы ільну будзе выцераблена машынамі. Гэта накладвае выключную адказнасць на ўсіх кіраўнікоў, асабліва ільнаводчых раёнаў за падрыхтоўку да гэтай работы. Трэба ўлічыць урокі мінулага года, калі шмат шыроказахватных «ВНІІЛ-5» не скарыстоўваліся, бо не былі падрыхтаваны адпаведныя кадры, аўладаўшыя гэтымі машынамі. Сёлета гэтага ні ў якім разе дапусціць нельга.

Пленум ЦК абавязаў да 1 ліпеня поўнасцю адраманцаваць усе ільноперабільныя машыны, на працягу чэрвеня праверыць падрыхтаванасць кожнага вазіцеля машыны, не пазней, як за 10 дзён да перабленя вызначыць у натуры плошчы для машыннага перабленя, кожнаму перабільшчыку ўручыць маршрут па скарыстанні ільноперабілкі з тым, каб перабленне правесці ў ранняй жоўтай спеласці на працягу не больш 8 дзён.

Да 1 ліпеня засталося толькі 20 дзён. Трэба па-большэвіцку ўзяцца за работу, каб выканаць гэтую дырэктыву Цэнтральнага Камітэта, забяспечыць паспяховую ўборку ільну.

Поспех уборачнай будзе залежыць ад чоткага, прадуманага плана арганізацыі ўборкі ў кожным калгасе, соўгасе, МТС. Правільная арганізацыя працы, правільная расстаноўка людзей і машын на ўчастках, чоткае і аператыўнае кіраўніцтва людзьмі—будуць вырашаць поспех гэтай адказнейшай кампаніі.

Пленум ЦК асабліва папярэдзіў супроць шкоднай самасупакоенасці, захаплення поспехамі, прытуплення пільнасці да падрыўной дзейнасці асталкаў класава-варожых элементаў. Гэтае цапяраджанне пленума мы абавязаны моцна ўлічыць. Трэба яшчэ і яшчэ раз улічыць урокі мінулых гадоў, калі пад уплывам класава-варожых людзей у радзе калгасаў мела месца супраціўленне справе механізацыі ўборачных работ, асабліва ў галіне скарыстання ільноперабілак «ВНІІЛ-5».

«Галоўная і рашаючая ўмова забеспячэння высокага ўраджаю,— запісана ў пастанове Пленума ЦК ВКП(б) — заключаецца зараз у тым, каб, ламаючы супраціўленне асобных работнікаў справе моцнага ўкаранення механізацыі ва ўсе галіны сельскагаспадарчай вытворчасці, зрабіць вопыт і дасягненні перадавых людзей соцыялістычнага земляробства, аўладаўшых машынай тэхнікай апрацоўкі і ўборкі, злабыткам усёй масы работнікаў калгасаў, соўгасаў і МТС».

Шырока разгортваючы стахановскі рух—гэту вышэйшую форму соцыялістычнага спаборніцтва — на падрыхтоўцы і правядзенні ўборкі, пераносячы вопыт і дасягненні лепшых камбайнераў, трактарыстаў, ільноперабільшчыкаў, машыністаў малатарань і т. д. ва ўсе калгасы, соўгасы, МТС, — забяспечым у тэрмін і без страт уборку высокага сталінскага ўраджаю, своечасовае выкананне абавязацельстваў перад дзяржавай па пастаўцы збожжа, загатоўках ільну і інш. сельскагаспадарчых культур.

Пры беларускай станцыі механізацыі сельскай гаспадаркі яшчэ зімой пачалі працаваць курсы камбайнераў. На курсах навучаюцца 110 чал., сярод якіх 6 жанчын. 1 ліпеня курсанты заканчваюць вучобу і прыступаюць да практычнай работы на камбайнах. НА ЗДЫМКУ: курсанты перад выездам на практычныя заняткі ў поле. (Фото Зайкава).

11 чэрвеня, у 6 гадзін вечара, у Доме партактыва склікаецца агульнагарадскі партыйны актыў. На парадку дня — даклад аб выніках чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б).

Білеты на партактыў будуць выдавацца ў горрайкомах КП(б)Б 11 чэрвеня з 10 да 3 гадз. дня.

ВОПЫТ ПАРТЫЙНАЙ ПРАПАГАНДЫ БОЛЬШЭВІКОЎ ГОРАДА ЛЕНІНА

Аддзел партыйнай прапаганды ЦК КП(б)Б арганізаваў экскурсію ў Ленінград лепшых прапагандыстаў, якія скончылі 6-месячныя курсы, для азнаямлення з пастаноўкай партыйнай прапаганды большэвікоў горада Леніна. Сёння мы змяшчаем артыкул, прысвечаны паказу гэтага вопыту работы.

Мы ездзілі ў **Ленінград** з мэтай азнаямлення прапагандыстаў, з лепшай пастаноўкай партыйнай прапаганды. Мы хочам расказаць аб тым вопыце работы, які лавінен быць перанесен у нашы партыйныя арганізацыі.

1. ПАРТЫЙНЫ ГАБІНЕТ ЗАВОДА ІМЯ АДПУ

У Ленінградзе мы знаёміліся з работай партгабінета завода імя АДПУ. Вялікую работу праводзіць партгабінет па аказанню дапамогі слухачам. Чатыры разы ў месяц за два дні да заняткаў слухачы прапрацоўваюць матэрыял пад кіраўніцтвам прапагандыста, якога выдзяляе партгабінет. Гэты прапагандыст прапрацоўвае з імі літаратуру па першакрыніцах, дапамагае складаць канспекты. Такая падрыхтоўка слухачоў дае выключна добры эфект у павышэнні якасці саміх заняткаў, у павышэнні актыўнасці адстаючых слухачоў і прывучае комуністаў працаваць над кнігай, канспектаваць матэрыял.

Партгабінет канцралюе ўсю работу партыйнай сеткі завода. Часта праводзяцца стэнаграмы заняткаў якога-небудзь гуртка, і потым на нарадзе прапагандыстаў разбіраюцца гэтыя стэнаграмы. Гэта вучыць прапагандыстаў, як трэба або не трэба праводзіць заняткі.

Наступны станоўчы момант у рабоце партгабінета — гэта арганізацыя тэарэтычных канферэнцый. У сувязі з праверкай партдакументаў было выяўлена, што рад комуністаў не ведаюць статута партыі. У матах найлепшага ўсвоення статута партыі была праведзена тэарэтычная канферэнцыя.

План гэтай канферэнцыі зацвярджаўся парткомам, агульным сходам прапагандыстаў і агульным сходам комуністаў завода. У план былі ўнесены канкрэтныя заўвагі і пасля гэтага ён стаў здабыткам усіх, хто рыхтаваўся да канферэнцыі.

2. ПАЎТОРНЫЯ КАНФЕРЭНЦЫІ

Наступны станоўчы момант у рабоце партыйнага габінета гэта арганізацыя паўторных канферэнцый для гурткоў, вывучаючых гісторыю ВКП(б).

Паўторная канферэнцыя была, напрыклад, праведзена па пытанню «рэвалюцыя 1905 — 1907 гг.». Канферэнцыя падводзіць вынікі ўсвоення гурткоўцамі пройдзенай тэмы, замацоўвае веды. Метад падрыхтоўкі і правядзення паўторнай канферэнцыі такі-ж, як і тэарэтычнай агульнай канферэнцыі.

Гэты метад падвядзення вынікаў усвоення гурткоўцамі прахадзімых тэм дае ацэнку ўсвоення мінулага, вучыць да самастойнай работы кожнага члена гуртка, таксама дае ацэнку рабоце самога прапагандыста.

У габінеце агітатара можна знайсці любую карту. Паміма геаграфічных карт свету Совецкага Саюза і асобных частак свету і краін ёсць карты-дыяграмы дыпламатычных адносін Совецкага Саюза з капіталістычнымі краінамі, карта захвату Кітая і дыяграма наступлення кітайскай Чырвонай арміі, карта, адлюстроўваючая ход італа-абісінскай вайны і т. д. У гэтым партыйным габінеце можна знайсці выразкі з газэт па любому пытанню, прычым ёсць спецыяльная дошка «Што новага сёння ў газетах і журналах».

Асаблівую ўвагу заслугоўвае работа з прапагандыстамі ў кіраўскім Доме партыйнага актыва.

Гэты Дом партактыва распрацоўвае спецыяльныя табліцы па курсу гісторыі ВКП(б). Усе гэтыя табліцы, дыяграмы і плакаты зацвярджаюцца інстытутам гісторыі ВКП(б).

Заняткі семінараў праводзяцца 5 раз у месяц. Прычым яны зараз дабіліся таго, што 3 разы ў месяц прапагандысты займаюцца з адрывам ад вытворчасці. Кожны прапагандыст ведае свайго консультанта, які дапамагае яму ў часе падрыхтоўкі да заняткаў.

Канспекты прапагандыстаў правярае кіраўнік семінара. Ён-жа прысутнічае на занятках гурткоў і заўсёды ўказвае прапагандысту яго недахопы.

Апрача вывучэння гісторыі ВКП(б) па першых крыніцах для прапагандыстаў арганізаван рад лекцый па літаратуры, геаграфіі.

3. ПРАПАГАНДЫСТ МАРГАЛІК

Вывучэнне гісторыі партыі прапагандыст Маргалік (завод «Русский дизель») увязвае з сучаснасцю. Кожная тэма па гісторыі партыі дапаўняецца выступленнямі слухачоў, удзельнікамі рэвалюцыйнай барацьбы ленінградскіх пролетарыяў з царызмам. Скарыстанне прапагандыстам успамінаў старых рабочых увайшло ў сістэму. Гэта ў значнай ступені аблягчае ўсвоенне слухачамі матэрыялаў па тэме.

Калі на занятках гуртка прапрацоўвалі тэму «Марксізм у барацьбе з народніцтвам», слухачы расказвалі аб прыгонным праве. Для таго, каб гэтыя яркія выступленні слухачоў сталі здабыткам усіх рабочых, на заводзе выпусцілі спецыяльны нумар насценгазеты «В помощь партучебе». У насценгазеце былі змешчаны выступленні слухачоў, расказы і ўспаміны не толькі саміх рабочых, але і іх родзічаў.

Скарыстанне наглядных дапаможнікаў робіць заняткі больш цікавымі і змястоўнымі.

4. БЯГУЧАЯ ПАЛІТЫКА

Адзін раз у пяцідневку ў партыйных школах завода **«Русский дизель»** адводзіцца час для разгляду пытанняў бягучай палітыкі. Слухачы расказваюць, якія вынесены рашэнні партыі і ўрада за пяцідневку, якія падзеі адбыліся ў міжнародным становішчы.

Даклады па гэтай тэме робяць самі слухачы. Яны-ж рыхтуюць розныя дыяграмы, падбіраюць адпаведны матэрыял. Тэзісы дакладчыка правярае прапагандыст. Пасля распрацоўкі тэмы на занятках увесь матэрыял уклейваецца ў спецыяльны альбом. У гэтым альбоме можна знайсці матэрыялы аб італа-абісінскай вайне, аб Кітаі, Мангольскай народнай рэспубліцы і рад іншых.

Пасля дэтальнай распрацоўкі тэмы слухачы праводзяць гутаркі з рабочымі свайго цэха. Такім чынам турток з'яўляецца школай падрыхтоўкі агітатараў.

Кіраўскі Дом партыйнага актыва дапамагае прапагандыстам рыхтавацца да заняткаў па пытаннях міжнароднай палітыкі. У габінеце прапагандыста складаюцца дыяграмы, карты, рэкамендуюцца артыкулы з газет, журналаў, якія трэба прачытаць прапагандыстам. З падзеямі спецыяльна знаёмяць прапагандыстаў, і пасля сталай падрыхтоўкі прапагандысты прапрацоўваюць гэтыя пытанні ў гуртках.

Прапагандысты рэкамендуюць слухачам чытаць мастацкую літаратуру. На заводзе «Русский дизель» заведзен альбом рэцэнзій. Пасля кожнай прачытанай кнігі слухачы абавязаны напісаць рэцэнзію. З рэцэнзіяй знаёміцца прапагандыст і ўстанаўляе як слухачы зразумелі прачытаную кнігу, указвае, што правільна ў рэцэнзіі і што няправільна.

Такім метадам прапагандыст сістэматычна дапамагае слухачам гуртка павышаць свой агульна-палітычны і культурны ўзровень.

ГРУПА ПРАПАГАНДЫСТАЎ. ЗАЛАТУХІН, ЕКЕЛЬЧЫК, КАРПЕКІН, ТОПАЗ, КУГЕЛЬМАН, МАНАХАЎ, ЗЫБІН, СПЕВА, ВОЎНА.

Група прапагандыстаў Беларусі, якая на працягу 10 дзён вывучала вопыт партыйнай прапаганды ленінградскіх партыйных арганізацый.

АЛЕКСЕЙ СТАХАНАЎ ПРЫНЯТ У ПАРТЫЮ

КАДЗІЕЎКА, 8 чэрвеня. (Кар. «Правды»). Партыйнай арганізацыяй шахты «Цэнтральная Ірміна» і Кадзіеўскім гаркомам было ўзбуджана хадайніцтва перад Данецкім абкомам аб прыёме Алексея Стаханава ў рады партыі. Данецкі абком пацвердзіў гэта хадайніцтва перад ЦК ВКП(б).

Рашэннем ЦК ВКП(б) Алексей Стаханаў прынят у члены партыі.

Сёння сакратар Кадзіеўскага гаркома тав. Казлоў уручыў Алексею Стаханаву партыйны білет (старога ўзору) за № 2958311.

Алексей Стаханаў, прымаючы партыйны білет, заявіў: «Рашэнне ЦК мяне да многага абавязвае. Буду высока насіць званне члена вялікай партыі Леніна—Сталіна».

ПІСЬМО РАМЭН РАЛАНА ЧУВАШСКАМУ ПАЭТУ

ЧЭБАКСАРЫ, 7 чэрвеня. (БЕЛТА). У сувязі з 30-гадовым юбілеем літаратурнай дзейнасці народнага паэта Чувашыі тав. Палярусава-Шэлепе Рамэн Ралан прыслаў пісьмо на імя праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў Чувашыі, у якім піша:

«Перадайце тав. Шэлепе мае найлепшыя пажаданні на будучае і мае віншаванні за мінулае, калі, не гледзячы на труднасці свайго жыцця і жыцця вашага народу да рэвалюцыі, ён здолеў захаваць жывым полымя свайго таленту і сваіх надзей. Я па-брацку паціскаю яго руку ад імя маіх французскіх сяброў, я радуюся і ганаруся разам з усімі намі, бо мы ўсе—члены адзінага чалавецтва, для якога не існуе рознасці рас і нацый, шчасце ці бяда адных—шчасце ці бяда другіх!

Я шчасліў, што вы цяпер атрымалі магчымасць развіцця, у чым было адмоўлена вам пры старым рэжыме.

Паверце-ж, дарагія таварышы, маёй сардэчнай дружбе».

ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

* 6 чэрвеня апошняй зборнай праграмай «до свидания» закрыўся першы сезон у **тэатры народнай творчасці.**

У пастаноўках тэатра прымала ўдзел каля 10 тыс. выканаўцаў. На сцэне тэатра дэманстравалі сваё мастацтва прадстаўнікі 30 нацыянальнасцей Совецкага Саюза. Тэатр наведала звыш 100 тыс. глядачоў.

***

* У Горкаўскім краі заканчваецца будаўніцтва першага ў Саюзе завода па вытворчасці **перакісу вадарода.** Пачынаецца мантаж абсталявання. Праектная магутнасць яго — 600 тон перакісу вадарода ў год.

***

* Брыгада ордэнаносца Варанцова, — Александраўскай МТС Фёдара **Тэрэўко** (Паўночны Каўказ) выпрацавала да пачатку чэрвеня на кожным трактары «Чэлябінец» ў перавоцве на мяккае ворыва 2.013 гектараў.

ПРАЦОУНЫЯ БССР АБМЯРКОУВАЮЦЬ ЗАКОНАПРАЕКТ АБ ЗАБАРОНЕ АБОРТАЎ І ДАПАМОЗЕ РОЖАНІЦАМ

РАДЗІЛЬНЫ ДОМ

У адзін з асенніх дзён у гомельскі радзільны дом звярнулася студэнтка аднаго з інстытутаў горада з просьбай зрабіць ёй аборт. Разгаварыўшыся і, уявіце сабе, што гэту дзяўчыну я ведаю з дзяцінства і прысутнічала пры яе родах. Яна звярнулася да мяне, як да ўрача, які ведае ўмовы яе жыцця з дня нараджэння. Пасля агляду я прышла да пераканання, што аборту ёй рабіць нельга, бо ён моцна адаб'ецца на здароўі цяжарнай. Я пачала тлумачыць ёй шкоду і небяспеку аборту.

Дзяўчына ні на што не згаджалася, яна ўпарта настойвала на аборце. Асноўным матывам у яе была сям'я. Я пачала ёй даказваць, што яна ўжо дарослая, не сёння, заўтра канчае інстытут, пачне жыць самастойна, незалежна ад сям'і. Пасля доўгіх перакананняў дзяўчына, плачучы, сказала мне:

— Софья Ільініпіна, падумаю, магчыма, што не зраблю.

Праз шэсць месяцаў яна з'явілася да нас у радзільны дом раджаць. Мы зрабілі ёй абязбольванне родаў. Яна нарадзіла сына. Радасць маладой маці цяжка перадаць.

Мы маем у нашай практыцы дзесяткі выпадкаў, калі маці спачатку не радасна сустракае з'яўленне на свет, на іх думку «лішняга» дзіцяці, у асаблівасці блізняцоў, а потым літаральна дрыжаць над кожным дыханнем дзіцяці.

У нашай шчаслівай краіне няма і не можа быць «лішніх» дзяцей. Я асабіста і ўвесь калектыў работнікаў радзільнага дома горача вітаем новы законапраект аб забароне абортаў, пашырэнні сеткі радзільных домаў, яслей і садоў і т. д. Мы ўносім некаторыя папраўкі да законапраекта, на нашу думку, даволі істотныя.

Жанчына, якая пакідае дзяцей мужу, павінна плаціць таксама аліменты на ўтрыманне дзяцей, як і муж у іншым выпадку. У жыцці мы сустракаемся даволі часта з такімі выпадкамі, калі муж жадае разводу з-за адсутнасці дзяцей з прычыны хваробы жонкі. У апошнім іншы раз вінават сам муж. На нашу думку, муж пасля такога разводу павінен спачатку, хаця-б на працягу года, дапамагаць матэрыяльна сваёй былой жонцы.

Гомельскі радзільны дом быў заснован у 1921 годзе. Цяжка параўнаць зараз былы мізэрны драўляны домік з нашым сучасным радзільным домам. У нас ёсць выдатны санпропуск, радзільнае аддзяленне зусім аддзелена ад пасляродавага. Добра абсталяваны радзільны пакой. У пачатку арганізацыі дома ў нас было 25 ложкаў, сёлета ёсць 105, а да канца года лік ложкаў будзе даведзен да 130.

У сакавіку гэтага года мы ўпершыню пачалі прымяняць абязбольванне родаў. Звыш 300 жанчын нарадзілі дзяцей без болю.

Наш радзільны дом абслугоўвае не толькі Гомель. Да нас прыязджаюць з Палесся, з Украіны, з Заходняй вобласці. Нядаўна намі былі выпушчаны 54 акушоркі, якія займаліся цэлы год на спецыяльных курсах пры радзільным доме. Яны накіраваны на работу ў хаты-радзільні і раённыя больніцы. Зараз ідзе другі набор на курсы.

Радзільны дом вельмі перагружан. Для хутчэйшага сканчэння прыбудовы Наркамат аховы здароўя павінен нам дапамагчы ў атрыманні будаўнічых матэрыялаў. Трэба падумаць таксама над адкрыццём радзільных дамоў у рабочых цэнтрах каля горада (Касцюкоўка, Новабеліца).

30 год я працую ўрачом-акушорам. Вельмі часта жанчыны, якія прыходзяць раджаць да нас, заяўляюць мне: «Ведаеце, Софья Ільініпіна, вы-ж мяне прымалі ў маёй мамы». Многія з «маіх» дзяцей сталі інжынерамі, урачамі. Я ганаруся сваёй прафесіяй. Выключныя бацькаўскія клопаты нашай партыі і ўрада, вялікага мудрага **Сталіна** аб жанчыне-маці, аб дзецях, — натхняюць мяне, не гледзячы на мае 56 год, працаваць яшчэ з большай энергіяй.

С. І. ЛІЎШЫЦ.

Дырэктар гомельскага радзільнага дома.

УЗМАЦНІЦЬ КЛОПАТЫ АБ ДЗЕЦЯХ

Мне 25 гадоў. У мяне 5-гадовая дачка Нэла. Я выхоўваю яе адна. Калі я прачытала праект закона аб забароне абортаў, дапамозе рожаніцам і шматсямейным, аб аліментах, дзіцячых садах і інш., я не магла ніяк супакоіцца. Усё думала, што так клапаціцца аб жанчыне і дзецях могуць толькі ў нас, у нашай краіне, якой кіруе комуністычная партыя і наш геніяльны любімы правадыр таварыш Сталін. Я вельмі адабраю і падтрымліваю законапраект.

Я хачу ўнесці ў праект закона такі пункт. Трэба павялічыць колькасць дзіцячых садоў і яслей у сельскіх мясцовасцях і каб яны працавалі на дзве змены. Трэба, каб кожная маці магла працаваць а пасля работы павышаць свой ідэйна-палітычны і культурны ўзровень. Мая дачка наведвае дзіцячы сад з 10 гадзін раніцы да 4 гадзін дня, а я працую ў МТС з 5 гадзін вечара і мне няма на каго пакінуць яе.

Апрача гэтага трэба, каб нашы прадпрыемствы выпускалі больш дзіцячых балетак, сандалей і інш. Для дзіця 5 год іх вельмі цяжка дастаць, а ў бацінках дзіцяці летам вельмі нязручна. Наконт пункта аб аліментах, — падтрымліваю прапанову Глафіры Міхайлоўскай, апублікаваную ў «Звяздзе» ад 5 чэрвеня, аб тым, што трэба ўнесці ў праект пастановы пункт аб адзнаце ў пашпарце бацькі, што ён плоціць аліменты.

ЛЕНА МІРАНОВІЧ.

Лагойск.

АБ ДЗІЦЯЦІ СЯМІ ГОД

У парадку абмеркавання законапраекта аб забароне абортаў, аб дапамозе рожаніцам, пашырэнні сеткі дзіцячых яслей і інш. хачу ўнесці адзін пункт, аб якім ніхто з выступаўшых яшчэ не ставіў пытання.

Трэба пры дзіцячых садах адкрыць нулявыя групы, як гэта было два гады назад, каб дзеці маглі пасля дзіцячага сада паступіць у школу. Многа жанчын, у тым ліку і я, сустракаюцца з такімі фактамі. Вось, напрыклад, у мяне ёсць сын Леанід, 7 год. З дзіцячага сада яго выпускаюць (перарос), а ў школу сёлета не прымаюць. Па-першае таму, што ў ёй няма нулёўкі, а па другое, яму няма васьмі год. Ставіцца пытанне, што мне ў даным выпадку рабіць. Ці працягваць працаваць, ці сядзець з хлопчыкам цэлы год дома?

ВАЙНШТЭЙН.

г. Менск.

ПАКОЙ ДЛЯ КАРМЛЕННЯ ГРУДНЫХ ДЗЯЦЕЙ

Жонка тэхнічнага дырэктара лугаса «Загалле», Любаньскага раёна, тав. Гульніцкая шэфствуе над дзіцячымі яслямі. Будынак яслей абнесён плотам, двор азеляняецца. Для дзіцячых гульняў зроблены скрынкі з пяском. У яслях арганізован спецыяльны пакой для кармлення маці грудных дзяцей.

У сакольніках (Масква) знаходзіцца дом адпачынку для цяжарных. У доме адпачынку ўстаноўлен для адпачываючых спецыяльны рэжым: гімнастыка, умацоўваючая мышцы жывата, штодзённы душ, спецыяльная дыета. НА ЗДЫМКУ: на занятках па гімнастыцы.

Фото Л. Баця (Брыгада Ігнатовіча). (Саюзфото).

ЖЫЦЦЁ ВЫДАТНЫХ ЛЮДЗЕЙ

ГЕОРГ СТЭФЕНСОН

Настомны будаўнік, інжынер-самавучка (вынаходца паравоза) **Георг Стэфенсон** нарадзіўся ў 1781 г. у невялікай вёсцы Вайлам, у 8 мілях ад г. Нью-Кестля ў Англіі.

Ужо самае нараджэнне, а тым больш далейшае выхаванне і работа ў цэнтры каменнавугольнай прамысловасці Англіі з'явіліся значнымі фактарамі ў справе росту і фармавання будучага стваральніка лакаматыва.

З дзяцінства Георг Стэфенсон жыве ў атмасферы патраб і інтарэсаў вуглекопаў і гарнякоў.

Ужо малалеткай прымае ўдзел у агульнай рабоце.

Ён служыў для сувязі доміка з вёскай, а разам з тым яму даручаўся нагляд за малышамі, якія без нагляду маглі-б папасці пад вялікія павозкі з вугалем (прататыш цяперашніх чыгуначных таварных вагонаў), якія непарыўна праязджалі міма дома Стэфенсонаў па спецыяльна пракладзеных рэйках.

Моцна ўрэзаліся ў памяці будучага вынаходцы гэтыя драўляныя рэйкі і гэтыя цяжарныя вагоны.

Уся вёска Вайлама амаль пагалоўна была непісьменнай, не давялося наведваць школы і юнаму Георгу.

Затое працоўны стаж яго работы па найму пачаўся вельмі рана.

З васьмі год ён пасвіў ужо кароў на ўзлашальніцы невялікай сядзібы недалёка ад Вайлама.

Атрымліваючы якое-небудзь харчаванне ад памешчыцы, маленькі Георг увесь свой заработак (5 пенсаў у дзень, пенс каля 2 з паловай кап.) аддаваў родным, якія ўжо ў той час адчувалі крайнюю патрэбу.

Між іншым абавязкі Георга ў гэты перыяд былі настолькі нескладаны, што знаходзячыся доўгія дні ў полі, ён не толькі мацнеў фізічна, але і мог удзяляць час для сваіх асабістых заняткаў.

*

І БРЫХНІЧОЎ І. СУРТА

*

«Маленькі Георг будаваў млынавыя колы і ставіў свае «машынкі» над раўчаком, які прыводзіў іх у рух; ён рабіў маленькія павозкі і рэйкі з дрэва і вазіў на павозачках розны цяжар. Нарэшце, разам з прыяцелем сваім Томам, хлопчыкам адных з ім гадоў, ён пачаў будаваць паравыя машыны. Матэрыялам яму служыла гліна, чарот, пробкі і т. п. У ліку зробленых ім машын адна зацікавіла ўвесь Вайлам і прымушала сходзіцца глядзець на яе ўсё мясцовае насельніцтва. Гэта была мініятурная мадэль пад'ёмнай машыны, дзеючай у капальнях. З вызлаўлёных кавалкаў пробкі Георг зрабіў скрынку для насыпкі руды, канаты замяніў, абрыўкамі шнуркоў, кавалкі дошак, абломкі цэглы і палачкі чароту паслужылі матэрыялам для пабудовы печы, паравіка, труб і іншых частак механізма. Б агульнаму здзіўленню гэты цацачны механізм дзейнічаў. Паравік даваў пару, якая прыводзіла ў рух спарад, скрынкі з рудой падніміліся і апускаліся, — словам, усё было як у сапраўднай машыне.

Машына 8-гадовага канструктара, аднак, праіснавала нядоўга. У адсутнасці Георга яна была зціпчана нейкім невядомым зайздроснікам.

Прапрацаваўшы ў памешчыцы параўнаўча нядоўга, Георг вярнуўся да традыцыйнай работы бацькоў і дзядоў — паступае ў капальні, дзе ў першы час, разам з старшым братам, займаецца сартаваннем вугалю, зарабляючы 15, потым 20 кап. у дзень.

Ад сартавання вугалю юны рабочы перакідваецца к пад'ёмнай машыне ў якасці пагоншчыка коней, прыводзіўшых у рух апошнюю, а чатырнаццаці год ён ужо працуе памочнікам качагара з акладам у шылінг у дзень.

Новая пасада адыграла рашаючую ролю ў жыцці Стэфенсона.

Задаўшыся мэтай стаць машыністам, ён прагне даведацца як мага больш аб машыне, уважліва прыглядаецца да яе работы, дасканала вывучае яе пабудову, стараннa вучыцца кіраваць ёю, чым неўзабаве практычна і авалодвае.

Вось абставіны, якія нельга абыйсці моўчкі. У процілеглась Эдысону, Уатту і многім іншым, у якіх падрыхтоўка да будучай дзейнасці накіроўваецца ад тэорыі, або паралельна тэорыі, як у Уатта, Стэфенсон спачатку ідзе выключна шляхам практычным, толькі на справе знаёміцца з машынамі і ўсвойвае прынцыпы іх пабудовы.

Пятнаццаці год, ганімы беспрацоўем, Стэфенсон, разам з усёй сям'ёй, перасяляецца ў Нью-Берн, дзе «Стары Боб» зноў паступае ў капальню ў якасці качагара, а сыны працуюць яго памочнікамі. Між іншым, некалькі пазней і Георга пераводзяць у адну з капальняў качагарам.

Яшчэ праз два гады Стэфенсоны перакачоўваюць на новае месца ў Ватэроэ, прычым Георг атрымлівае месца наглядчыка пры пампавальнай машыне. Фактычна ён не толькі наглядае за машынай, але і яясе абавязкі механіка.

Практыка немінуча прыводзіць Стэфенсона да тэорыі.

Возячыся з машынай і думаючы над яе недахопамі і магчымасцямі знішчыць іх, Георг зварачаецца да чарцяжоў, але тут пачынае разумець, як цяжка яму ісці далей без тэарэтычных ведаў. Хоць яму ўжо 18 год, ён рашуча бярэцца вучыцца.

Штодзённа на сканчэнні работ у капальнях практык-механік ідзе ў суседнюю вёску да настаўніка і, заняўшыся з ім з дзве гадзіны, варочаецца да хаты, каб усю астатнюю частку ночы, вырваную ад сну, прапрацаваць над кнігамі.

«Удзень юнак таксама карыстаўся ўсякай зручнай мінутай, каб зноў звярнуцца да сваёй кнігі або дошкі. Для акружаючых такая цяга да вучобы дарослага хлапца здавалася досыць недарэчнай, і яны ўзнімалі яго на смех. Стэфенсон быў, аднак, з тых натур, якія **паставіўшы сабе якую-небудзь мэту, упарта ідуць да дасягнення яе** (падкрэслена намі — **Б., С.**). Такім быў усё сваё жыццё і тую-ж якасць ён выявіў пры вывучэнні пісьменнасці».

Усвоіўшы за адну зіму ўсю няхітрую мудрасць свайго настаўніка, Георг не толькі не спыняе сваіх заняткаў, але яшчэ з большай упартасцю і настойлівасцю імкнецца аўладаць такой неабходнай (як ён у гэтым паспеў ужо ўпэўніцца, працуючы над машынамі) для далейшага росту яго творчых сіл, нехапаючай яму тэорыяй.

Між тым ён атрымлівае новае прызначэнне — кіраваць спарадам, рэгулюючым у капальнях рух скрыняў з вугалем з шахт.

Каб растырыць свае рэсурсы, Стэфенсон вучыцца шавецкаму рамяству.

У 1802 г. Георг пераходзіць на службу ў Велінгтон, недалёка ад Нью-Кестля. Да гэтага перыяда адносіцца першая спроба Стэфенсона вынаходзіць (не лічачы дзіцячых і юнацкіх спроб і забаў).

Як і многія пачынаючыя вынаходцы і самавучкі, ён пачаў з **перпетуум мобіле.** Але пабудаваная ім **«вечна-рухаючаяся машына»** (у якой у якасці рухавіка Стэфенсон ўжыў ртуць), аднак, ніяк і нікольскі не рухалася.

З Нью-Кестля ён пераходзіць на службу ў Клінгворт, але зноў варочаецца ў Нью-Кестль.

Каля гэтага часу дзве акалічнасці высоўваюць Стэфенсона, як вопытнага вынаходлівага механіка.

У адной машыны працірацца пасы, Георг прапануе змяніць размяшчэнне колаў апарата, і работа пачынае ісці хутчэй, а пасы зношваюцца значна павальней.

У другі раз Стэфенсону паведамляюць, што чарпальная машына, устаноўленая ў адной з капальняў для адпампоўвання вады, працуе настолькі нездавальняюча, што прышлося спыніць здабычу вугалю.

Усе спробы інжынераў наладзіць машыну асталіся бясплённымі.

Стэфенсон, агледзеўшы машыну, абвяшчае, што не толькі выправіць яе і прымусіць працаваць без перабояў, але што і вада з капальні будзе выпампавана не пазней як на працягу тыдня.

Машына хутка была папраўлена, як і абяцаў механік, вада выпампавана і нават не за тыдзень, а за два дні.

Гэтыя два буйныя поспехі з'явіліся пераломным момантам у жыцці вынаходцы.

Стэфенсон атрымлівае назначэнне механікам у адну з капалень з досыць значнай па таму часу аплатай.

Самавучка-механік перарастае ўжо ў вынаходцу.

Ён пабудаваў **блокавую машыну для пад'ёму грузаў:** груженыя вагончыкі ў сілу ўласнай вагі скочваліся ўніз, падымаючы пры гэтым уверх парожнія вагончыкі. Гэтым ён скараціў лік патрэбных для капалень коней з 100 да 16.

На адной з капалень паставіў **помпу ўласнай сістэмы.**

Вынайшаў перасперагальную безапасную **лямпу для гарнякоў.**

Так паступова, вучачыся, працуючы і прабуючы свае сілы, падышоў Стэфенсон шчыльна і да найвялікшага са сваіх вынаходстваў— да **лакаматыва.**

Калі параўнаць першы паравоз Стэфенсона з сучаснымі лакаматывамі, то розніца паміж імі рэзка кінецца ў вочы.

Першая машына Стэфенсона, названая «Блюхер» (у гонар пераможцы пры Ватэрлоо), была пабудавана вынаходцам у 1814 годзе, цягнула груз усяго толькі ў 30 тон з хуткасцю 4 мілі ў гадзіну (6 вёрст), але яна перавысіла ўжо ўсё папярэднія спробы лёгкасцю ходу і бесперапыннасцю работы.

У наступныя гады Стэфенсон пабудаваў другую машыну, яна «мела вертыкальныя цыліндры, умацаваныя на спінцы катла, а крывашыпы прыводзіліся ў дзеянне доўгімі шатунамі паабапал машыны. Пярэдняя і задняя восі злучаны былі бясконцым ланцугом, ахапляючым зубчатыя колы. Найбольш цікавай падрабязнасцю ў гэтай машыне было тое, што ў якасці рэсораў ужыты былі цыліндры з поршнямі і выкарыстана была ўпругасць паветра». Але галоўным дасягненнем Стэфенсона на данай стадыі развіцця паравоза быў яго славуты «конус».

Т. Корбін у сваёй кнізе «Поспехі сучаснай тэхнікі» дае такое апісанне гэтага выдатнага новаўвядзення:

«У дымавой каробцы знаходзіцца надзвычай важнае прыстасаванне, так званы «конус». Толькі дзякуючы яму ўдаецца атрымаць у параўнальна невялікім катле дастатковую колькасць пары. Трэба памятаць, што кацёл паравоза значна меншы ў адносінах да колькасці пары, якую ён павінен развіць, — чым стацыянарны кацёл. Іменна таму, замест адной або двух жаровых труб, у ім устанаўляецца вялікая колькасць вузкіх труб, каб цяпло магло пераходзіць у ваду праз магчыма большую паверхню. Але гэта цягне за сабою тую невыгоду, што нагрэтыя газы яе могуць праходзіць даволі хутка праз вузкія трубы; апрача таго, паравозны кацёл пазбаўлен той перавагі, якая ёсць у стацыянарнага катла, а іменна, высокай дымавой трубы, якая стварае моцную цягу. Таму, калі не наладзіць якой-небудзь штучнай цягі, гарэнне не адбудзецца дастаткова хутка.

У першы час гэта акалічнасць і складала адно з галоўных затрудненняў для Стэфенсона, пакуль ён не напаў на шчаслівую ідэю пабудаваць памянёны «конус». Гэта — труба, змешчаная на дне дымавой каробкі, з адтулінай, накіраванай уверх да дымавой трубы; па ёй пара праходзіць з цыліндраў, вырываецца магутным струменем уверх у дымавую трубу і гэтым стварае моцную цягу ў дымагарных трубах катла».

У 1816 годзе Стэфенсон узяў патэнт на свой **паравоз.**

Аднак, **паравоз «Ракета»**, пабудаваны ім у 1829 г., быў дасканалей за ўсе папярэднія.

Важнейшыя асаблівасці «Ракеты» — ужо ўказаны «конус», кацёл (пабудаваны па парадзе Бута па прынцыпу французскага вынаходцы гатавальніка Сегуіна), які складаўся са значнай колькасці маленькіх трубак, праводзіўшых гарачыя газы, і дзякуючы гэтаму ўладаўшы вялікай паверхняй нагрэву. Апрача таго, цыліндры ў «Ракеце» былі размешчаны не вертыкальна, як у ранейшых паравозах, а нахільна.

«У выніку яно яшчэ больш наблізілася да гарызантальнага... Пазней быў дадан «кулісны» механізм, дзякуючы якому з'явілася магчымасць хутка мяняць напрамак руху машыны і лёгка змяняць ступень расшырэння».

З гэтымі і радам іншых удасканаленняў і змен, унесеных Стэфенсонам у свой паравоз, апошні не толькі ўсямерна перавысіў усіх сваіх папярэднікаў і прататыпаў, але ў канчатковай канструкцыі ўладаў і асноўнымі рысамі навейшых лакаматываў.

(Канец у наступным нумары)

ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ ЛЕНКУТКА

(Пісьмо стаханаўцаў)

У промкааперацыйнай арцелі «Сіла працы» (Бабруйск) выпрацоўваюцца валенкі і шчоткі. Працуе ў ёй 160 чал. Прадукцыі выпускаецца на 2 мільёны ў год.

Памяшканне ў арцелі малое. Няма пакою для дзяжурных пажарнікаў. Пакой ленкутка адначасова з'яўляецца і сталоўкай. Не гледзячы на гэта горсовет пастанавіў перадаць наш ленкуток пад раздзявалку хлебазаводу, які змяшчаецца побач з арцелью. Гэтым горсовет парушыў пастанову СНК аб тым, што памяшканні кааперацыі не падлягаюць із'яццю, а толькі ў выпадку неабходнасці могуць быць заменены па ўзаемнай згодзе.

Мы, стаханаўцы арцелі, просім пакінуць за намі наша памяшканне.

ХАЛОДНЕР, ГІНЗБУРГ і інш.
(усяго 9 подпісаў).

ЖЫВЕМ АБЯЦАНКАМІ

(Пісьмо члена праўлення калгаса)

Наш калгас «Чырвонаармеец» (Амхоўскі сельсовет, Магілеўскі раён) першым у мінулым годзе прадаў дзяржаве 40 тон хлеба. У парадку атаварвання праданага хлеба мы заключылі з райсаюзам дагавор, па якому райсаюз (старшыня Кашын) абавязаўся выдзяліць для калгаса грузавую машыну не пазней снежня.

У студзені гэтага года ў райсаюз прыбылі чатыры аўтамашыны. Аднак гэтыя машыны былі размеркаваны паміж іншымі калгасамі, а нам абяцалі даць праз некалькі дзён.

З таго часу ўжо мінула пяць месяцаў, а машыны ўсё няма.

АРЛОЎ.

СПЫНІЦЬ ЗНІШЧЭННЕ КАШТОЎНАЙ РАСЛІНЫ

(Пісьмо служачага)

Кожны год перад святамі знішчаецца па Беларусі некалькі дзесяткаў тон каштоўнай расліны — лікаподзія (дзеразы). Гэта расліна вырываецца з карэннямі. Між іншым, яго пыльца — каштоўны прадукт у медыцыне і тэхніцы. Яна з'яўляецца дафіцытным таварам у ліпейнай прамысловасці.

Адзін кілограм пыльцы лікаподзія каштуе 8 руб., а па Беларусі штогод загатаўляюць да 15 тон пыльцы.

Знішчэнне лікаподзія трэба забараніць. Упрыгожванне памяшканняў можна замяніць іншымі менш каштоўнымі раслінамі.

ЧУЯНАЎ

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЗВЯЗДЫ»

«ЗАБЫЛІСЯ АБ ЖЫВЫХ ЛЮДЗЯХ»

Сакратар Гарадоцкага райкома партыі паведаміў рэдакцыю што факты, указаныя ў карэспандэнцыі «Забыліся аб жывых людзях», поўнасцю пацвердзіліся.

Бюро РК апошні раз папярэдзіла дырэктара МТС тав. Аўдзейчыкава аб недапушчэнні начальніх бюракратычных адносін да трактарыстаў. Пры паўтаранні падобных фактаў, да яго будуць прыняты больш суровыя меры партыйнага спагнання.

Члену РК тав. Геніну і парторгу МТС тав. Сухарыцкай прапанавана абгаварыць матэрыялы «Звязды» і рашэнні бюро РК на партыйным сходзе партарганізацыі МТС і прыняць канкрэтныя мерапрыемствы да ліквідацыі існуючых недахопаў у рабоце.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ РЫХТАВАЦЦА ДА ЎБОРКІ ЎРАДЖАЮ

Камбайнеры

Комсамолец Іван Васільевіч Грыцкевіч на курсы камбайнераў прыехаў у Менск з Танежыцкай машынатрактарнай станцыі. Там ён працаваў механікам па рамонту. Ніколі не бачыўшы камбайна Грыцкевіч у першы дзень, калі пайшлі курсанты ў гараж, сур'ёзна задумаўся.

— Машына складаная, але я ёю авалодаю.

Аб гэтым марыў не адзін Грыцкевіч. Такую задачу паставілі перад сабою і астатнія курсанты.

Сто трынаццаць чалавек прыбыла на курсы. Іх размясцілі ў чыстым, утульным памяшканні, склалі ўсе ўмовы для вучобы. Раніцою, днём і ўвечары можна было бачыць курсантаў каля камбайна. Увесь дзень праходзіў у дзелавой і напружанай рабоце. І так на працягу 5 месяцаў.

Калі ў першыя дні вучобы словы «букер», «шнэк», «біцэр», для курсантаў былі незнаёмымі і дзіўнымі, то ўжо праз месяц курсант Грыцкевіч падрабязна расказваў на лекцыі не толькі значэнне букера і шнэка, ён расказаў аб законе інерцыі, аб перанясенні сіл, аб законе руху, аб сіле ціску.

На 6 месяцаў была разлічана праграма курсаў. Ні адзін курсант за ўвесь час вучобы не парушыў працоўнай дысцыпліны. Усе гаралі адным жаданнем—хутчэй скончыць вучобу, сесці за руль гэтай магутнай машыны.

— На курсы з'ехаліся людзі розных падрыхтоўкі, — кажа дырэктар курсаў тав. **Мацэпура,**— прыходзілася многа працаваць, каб навысіць агульнае развіццё некаторых курсантаў, але гэта не было тормазам у паспяховай рабоце. Мы праграму з курсантамі прайшлі за 5 месяцаў, не зніжаючы якасці вучобы.

Трактарысты, механікі, радавыя калгаснікі — будучыя камбайнеры—працавалі па-стаханаўску. За 5 месяцаў вучобы яны добра авалодалі такімі прадметамі, як камбайн, тэхнічная механіка, слесарная справа, арыфметыка, палітыка партыі ў вёсны, чарчэнне, агратэхніка, сушка зярна і г. д.

На курсах па ўсіх прадметах ёсць 30 выдатнікаў — Грыцкевіч, Навіцкі, Мяпельскі, Самчук і іншыя. Па камбайну ёсць 50 выдатнікаў — Грыцкевіч, Купкоўскі, Луцэвіч, Малашонка, Лобан, Пашчэня, і іншыя. Усе яны па тэорыі і практыцы маюць адзнаку «выдатна». Гэтыя людзі самі могуць разабраць і скласці камбайн. Яны ўжо не пытаюць у выкладчыка, як вастрыць нажы рэжучага апарата. Курсантаў зараз хвалюе адно—хутчэй скончыць вучобу, паехаць у сваю МТС, пазнаёміцца з калгасам і ўчасткам, дзе яны будуць весці магутную машыну—камбайн.

У гэтым годзе на палях БССР уборку зернавых будуць праводзіць 120 камбайнаў.

У апошнія дні курсанты напружана рыхтуюцца, паўтараюць пройдзенае, яшчэ раз правяраюць сябе на практыцы, каб выехаўшы па поле, працаваць без замінкі.

19 чэрвеня адбудзецца выпуск камбайнераў. Кожны курсант паедзе ў сваю МТС на працу.

Д. МАЛЕВІЧ.

ПАЧАЛІ КАСІЦЬ

ПУХАВІЧЫ. Перадавыя калгасы раёна, якія паспяхова спраўляюцца з праполкай і іншымі сельскагаспадарчымі работамі, прыступілі да сенакашэння заліўных і балотных двухукосных сенажацей.

Косяць ужо калгасы Пудзіцка-Слабодская сельсовета — «Вызваленне», «17 партз'езд», «Пяцігодка», калгас імя Сталіна. Супінскага сельсовета, соўгас «Бабы», Блужскага сельсовета.

Калгас «Вызваленне» здаў ужо дзяржаве 2,5 тоны сена.

НОВАЯ БУЛЬБАКАПАЛКА



У гэтым годзе выпускаецца 4.000 бульбаўборачных машын канструкцыі інжынера МАЦЭПУРА. Менская станцыя механізацыі сельскай гаспадаркі зараз выпрацавала новую канструкцыю бульбакапалкі, якая механізуе ўборку на 75 проц. (канструкцыя бульбакапалкі 1935 г. механізуе ўборку бульбы толькі на 55 проц.). Новая канструкцыя разлічана на цягу гусенічнага трактара «універсал-3» і мае дадатковае прыстасаванне — з-заду барабана ўстаноўлены дадатковыя транспарцёры для аддзялення зямлі ад бульбы, а таксама клубней ад батвы. Пры рабоце на бульбакапалцы канструкцыі 1935 года бульба і батва кладуцца разам. Пры рабоце-ж новай машынай батва кладзецца ў адну вузкую ленту, а побач укладваецца ў асобную істужку і бульба.

(Фото Ліліна).

СКОНЧЫЦЬ БУДАЎНІЦТВА ГУМНАЎ, КРЫТЫХ ТАКОЎ, ЗЕРНАСУШЫЛАК

Трэба, аднак, прызнаць, што будаўніцтва гумнаў і зернасушыльняў у калгасах разгортваецца зусім нездавальняюча. Даволі сказаць, што з 1.000 зернасушыльняў сістэмы інжынера Ўварава, якія па плану павінны быць пабудаваны да пачатку ўборачнай, на 1-е чэрвеня пабудавана толькі 24. Пачата будаўніцтва толькі 450 об'ектаў. Па раёнах ільноканапляводчага кіраўніцтва НКЗ патрэбна пабудаваць 414 зернасушыльняў. Ні адна з іх яшчэ не скончана. З 1.000 гумнаў пабудавана толькі 30.

Дзе прычыны такога непрыпімага становішча з будаўніцтвам у калгасах?

Асноўная прычына ў тым, што партыйнае і совецкае кіраўніцтва значнай часткі раёнаў Беларусі не займаецца будаўніцтвам. Райземаддзелы, якія непасрэдна павінны арганізаваць і кіраваць гэтай справай, часта абмяжоўваюцца аднымі цыркулярамі.

«Звязда» ўжо прыводзіла шмат фактаў нікудышнага кіраўніцтва будаўніцтвам у **Чэрвеньскім, Мазырскім, Смалявіцкім** і іншых раёнах. Узор безадказнасці ў справе арганізацыі будаўніцтва зернасушыльняў паказаў **пухавіцкі** райземаддзел. Атрымаўшы заданне пабудаваць у раёне 9 зернасушыльняў, райземаддзел спусціў заданне калгасам толькі на 2 сушыльні. Зусім не кіруюць будаўніцтвам зернасушыльняў, крытых такоў і гумнаў у **Быхаўскім, Сенненскім, Мехаўскім, Смілавіцкім, Ушацкім, Церахаўскім, Асвейскім і Ветрынскім** раёнах.

Нельга прайсці і міма Наркамзема БССР. Яшчэ 11 студзеня СНК БССР і ЦК КП(б)Б абавязалі Наркамзем стварыць неабходны апарат па будаўніцтву ў калгасах, забяспечыць будаўніцтва сістэматычным кіраўніцтвам і тэхнічнай кансультацыяй. Але Наркамзем дрэнна кіруе будаўніцтвам. Апарат па будаўніцтву фактычна не створан.

У свой час Наркамзем спусціў раёнам плакат «Калгасная сушыльня канструкцыі інжынера А. М. Уварава». Гэта і ўсё, што зрабілі ў Наркамземе, хоць ён абавязан быў да 10 лютага даць калгасам ясны праект пабудоў, абавязан даваць тэхнічную кансультацыю. У занальных кіраўніцтвах Наркамзема не так ужо мала інжынераў і тэхнікаў-будаўнікоў, яны-б маглі многа дапамагчы раёнам у будаўніцтве. Але пакуль што гэтага няма. Спецыялісты па будаўніцтву ў раёны не выязджаюць, тэхнічная кансультацыя не наладжана, не наладжан кантроль за ходам будаўніцтва.

Наркаммясцпром абавязан быў, згодна рашэння ЦК КП(б)Б і СНК БССР, на сваіх заводах загатовіць да 5 мая 1.000 вентылятараў тыпу «Сірока» для калгасных зернасушыльняў. Тэрмін гэты даўно мінуў, а калгасы пакуль што атрымалі толькі 56 вентылятараў. 500 вентылятараў павінен быў даць аршанскі завод «Красный боец», але ён не даў яшчэ ніводнага. Белсельгасснаб толькі канстатуе факты, а не прымае ніякіх мер, каб заводы выканалі заключаныя з імі дагаворы па вырабу вентылятараў.

З Чэрвеньскага, Смілавіцкага і раду іншых раёнаў паступаюць сур'ёзныя сігналы, што ў многіх калгасах распачатае будаўніцтва спынілася, што выведзены толькі сцены, што не хапае дахавага матэрыялу. Аб скарыстанні-ж мясцовага матэрыялу мала думаюць.

Выключная ўвага павінна быць аддана будаўнічым брыгадам у калгасах. Гэтага пакуль што няма. Нікім не адзначаецца работа лепшых будаўнікоў, якія даюць высокую якасць і перавыконваюць нормы, дюдзі з будаўніцтва часта перакідваюцца на іншыя работы. З гэтым трэба зараз-жа пакончыць. Трэба шырока разгарнуць стаханаўскі рух на будаўніцтве, будаўнікам-стахановам трэба стварыць найлепшыя ўмовы работы.

Разам з новым будаўніцтвам такіх об'ектаў, як зернасушыльняў Уварава, гумнаў і крытых такоў, павінны быць выкарыстаны старыя гумны, звычайныя асеці, якія ёсць у кожным калгасе. Іх трэба ачысціць, правесці адпаведную дэзінфекцыю. І з гэтым нельга цягнуць.

І. ШЛЯФЕР.

На касьбе

У калгасах Хойніцкага раёна распачата масавае сенакашэнне. На 5 чэрвеня скошана 900 гектараў. У соўгасе **«Перамога соцыялізма»** скошана 150 гектараў. Сярод касцоў разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва. Рабочыя **Яшчэнка Грыгор** 1 чэрвеня замест нормы 0,55 гектара скасіў 1 гектар 43 сот. і зарабіў за гэты дзень 18 р. 82 кап.

Больш чым у два разы перавыконваюць норму па сенакашэнню рабочыя соўгаса **Быліцкі Іван, Калашэнка Павел** і інш. За 7 дзён у калгасе **«Пролетарый № 1»**, Стралічанскага сельсовета, скошана 270 гектараў сенажаці, з іх застагавана 240 гектараў.

Разрыву паміж сенакашэннем і ўборкай няма. Уперадзе па сенакашэнню ідуць брыгады тт. **Пранязава** і **Тарасенкі**. Лепшыя касцы гэтай брыгады **Фёдараў Ілья, Данілка Андрэй, Чэркас Грыгор, Шульжэнка Пётр і Шульжэнка Майсей** замест нормы 0,40 гектараў выкашваюць па 0,80 гектараў. На сенакосе арганізавана грамадскае харчаванне, рэгулярна застаўляюцца газеты. Калгаснік **Назарэнка Алексей** у час адпачынку праводзіць чытку газет.

Арк. КАЗІМІРЧУК.

УБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ АДРАМАНТАВАНЫ

Да 27 мая соўгас «Х-годдзе БССР», якім кіруе ордэнаносец т. **Прорвіч**, прапалоў 47 гектараў яравых зернавых культур, 5 гектараў гародніны, правёў двухразовае акучванне бульбы на плошчы 91 гектар.

Зараз соўгас рыхтуецца да ўборкі ўраджаю. Да 27 мая дэтальна агледжаны і адрамантаваны 33 трактары, 7 трактарных і 5 конных касілак, 7 жнярак-самаскідак і 2 снопавязалкі, 5 конных грабель і 8 складаных малатарні.

Увесь уборачны інвентар, машыны соўгаса гатовы да ўборкі высокага сталінскага ўраджаю.

С. КАРОТКІН.

Любань, соўгас «Х-годдзе БССР».

ЖАНГЛЁРЫ ЛІЧБАМІ

З майстрам паліровачнага пэха менскай шчотачнай фабрыкі тав. Капланам нядаўна быў такі курёзны выпадак. Яго запыталі, ці павялічыўся лік стаханаўцаў у яго цэху. Не ведаючы, што адказаць, ён тут-жа звярачаецца да работніц — вы не ведаеце, колькі ў нас цяпер стаханаўцаў?

Мы прывялі гэты факт не выпадкова. У такім становішчы апынуліся амаль усе кіраўнікі фабрыкі, калі ў іх хацелі даведацца аб становішчы стаханаўскага руху на фабрыцы. Праўда, некаторыя з іх сталі капацца ў старых спісах, прыводзіць ледзь не леташнія лічбы. А як зараз, ці многа стаханаўцаў на фабрыцы — ніхто не ведае. Мы звярнуліся да «выратоўчага» спісу, які не без цяжкасцей знайшлі ў канторы. У ім запісана 277 чалавек. Але гэты спіс быў складзен некалькі месяцаў таму назад, яшчэ да ўвядзення новых норм. Многае цяпер на фабрыцы змянілася. На асваенні новых норм выраслі новыя стаханаўцы, а некаторыя даўно перасталі быць стаханаўцамі. А ў спісе нічога не змянілася. Адміністрацыя прадаўжае казырэць гэтым спісам, як дакументам, які паказвае, што калісьці яны сапраўды займаліся стаханаўскім рухам і нават мелі поспехі.

Такі час на шчотачнай фабрыцы сапраўды быў. Было гэта, праўда, даўно, на першым этапе стаханаўскага руху, яшчэ да новых норм. Тады і спісы складалі. Але гэты час ужо мінуў. Цяпер на фабрыцы стаханаўцаў стала значна больш. Узяць, напрыклад, набівачна-аўтаматны пэх. Да ўвядзення новых норм тут было 55 стаханаўцаў, цяпер 63. У паліровачным цэху пасля ўвядзення новых норм выраслі такія стаханаўцы, як Шулькіна, якая выконвае новыя нормы на 200 — 210 проц.

Але цяпер фабрычныя арганізацыі яўна аслабілі кіраўніцтва стаханаўскім рухам, пусцілі гэту работу на самацёк. Гэта прывяло да застою стаханаўскага руху, да памяншэння ліку стаханаўцаў.

За апошнія некалькі месяцаў далейшае развіццё стаханаўскага руху тармазілі аўтаматы. Імпартныя аўтаматы ў апошнія два месяцы больш стаялі, чым працавалі. Яны не забяспечаны запаснымі часткамі. І вось стаяць аўтаматы, зрываецца работа і ў другіх пэхах. Напрыклад, паліровачны пэх. Стаханаўская брыгада тав. Шулькінай намнога перавыконвала нормы выпрацоўкі. Але прастоі аўтаматаў не даюць магчымасці працаваць па-стаханаўску. Між тым, прастояў дарагога імпартнага абсталявання ў значнай ступені можна было-б унікнуць. Вырабляюцца-ж цяпер на фабрыцы і некаторыя запасныя часткі. Чаму-ж за гэту справу нельга было ўзяцца раней?

Адна з лепшых форм арганізацыі стаханаўскага руху, вырошчвання новых стаханаўцаў — гэта вучоба рабочых на вопыце стаханаўцаў, практычны паказ стаханаўскіх метадаў работы тут-жа ля варштата, ў цэху. Гэты метад вырошчвання новых стаханаўцаў ігнаруецца. Адміністрацыя фабрыкі і фабком многа гаворыць аб стаханаўскім руху, але штодзённай арганізаванай рабочага месца, як і ўсяго вытворчага працэсу, перадачай вопыту стаханаўцаў яны не займаюцца. А вядома, што агульныя разважанні аб стаханаўцах даюць вельмі мала карысці.

З тэхнічнай вучобай справы не лепшыя. Праўда, тэхпроп фабрыкі тав. Батарэвіч ўпэўнен, што тэхвучоба пастаўлена добра. Але гэта толькі ва ўяўленні і ў спісах Батарэвіча. На паперы сапраўды нічыцца, што на фабрыцы ёсць стаханаўскія школы першага і другога туру і курсы ІТР. Лічаць, што другім турам вучобы (вучоба стаханаўцаў) ахоплена 120 чалавек. Між тым наведваюць заняткі толькі 50 чалавек і то з вялікімі перабоямі. Як-жа можна верыць спісам Батарэвіча?

Некалькі лепш арганізуюць стаханаўскі рух у набівачна-аўтаматным цэху. Тут сапраўды рабочым дапамагаюць асвоіць новыя нормы, навучаюць працаваць па-стаханаўску. Для гэтага вызначан лепшы майстар пэха тав. Расін. Але ўсё гэта арганізацыйная работа не дае належнага эфекту з-за пастаянных прастояў аўтаматаў.

Майскую праграму фабрыка выканала ўсяго на 97 проц. Гэта — самы яркі паказальнік таго, што кіраўніцтва фабрыкі не змагаецца за далейшае разгортванне стаханаўскага руху, пусціўшы гэту справу на самацёк.

РОТМІЛЬ.

ДОМ СОЦКУЛЬТУРЫ

У часе абедзенага перапынку ў бібліятэку зайшоў пажылы гадоў пад пяцьдзесят калгаснік.

— Дайце мне, Міхаіл Тарасавіч, што-небудзь пачытаць.

Загадчык дома соцкультуры Міхаіл Краўчэня ветла адказаў, паказваючы на доўгі, усланы рознымі газетамі і журналамі, стол.

— Калі ласка... Вось свежанькія газеты і журналы.

Калгаснік адмоўна пакруціў галавой.

— Не, я чытаць тут не магу... У нас-жа цяпер абед, а потым зноў трэба на работу. Вы мне якую-небудзь кнігу — раман, ці расказы... Дома вечарамі буду чытаць.

Краўчэня адчыніў вялікую шафу і пачаў перабіраць на паліцах прыгожа расстаўленыя кнігі. Да шафы падышоў і калгаснік.

— Знайдзіце мне «Как закалялась сталь», ці «В боях за Перекоп»...

— Няма гэтых кніг. Адну ўзяў чытаць Сумар Іван, а другую — Коржыжаноўская Поля. Калі прачытаюць яны, магу даць вам, а зараз возьміце якую-небудзь іншую.

— А Максіма Горкага ёсць што?

— Ёсць... Толькі вось аднеслі кнігу Горкага «Дело Артамоновых».

— Давайце. А на кнігу «Как закалялась сталь» запішыце мяне ў чаргу.

Такі малюнак можна наглядаць кожны дзень у бібліятэцы дома соцкультуры калгаса «Прамень комуны». Летні час і палявыя работы зусім мала адбіліся на рабоце гэтага дома соцкультуры і бібліятэкі. Раніцой, у часе абедзенных перапынкаў і асабліва ўвечары заўсёды можна ўбачыць у бібліятэцы і чытальні калгаснікаў.

Мала каго вы знойдзеце ў калгасе «Прамень комуны», які не чытаў-бы газету, журнал або кнігу. Тут калгаснікі і калгасніцы ў вялікай дружбе з газетай і кнігай

Вось, скажам, чытаемасць кнігі.

Усяго ў бібліятэцы калгаса каля 2.000 розных кніг. Тут ёсць творы Леніна і Сталіна, ёсць розная палітычная літаратура. Асабліва багата бібліятэка мастацкай літаратурай. Тут ёсць кнігі Горкага, Дзем'яна Беднага, Новікава-Прыбоя, Шолахава, Панферава, Гладкова, Алексея Талстога, Ільі Эрэнбурга, Серафімовіча, Пільняка, Аўдзеенка, Островскага і рад іншых. З беларускіх совецкіх пісьменнікаў — кнігі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Галавача, Александровича, Петруся Броўкі, Лынькова... Ёсць творы замежных пісьменнікаў.

І, не гледзячы на багатую бібліятэку, усё-ж часамі калгаснік ідзе з бібліятэкі не з той кнігай, якую ён хацеў спачатку атрымаць.

— Вельмі вялікі попыт на мастацкую літаратуру, гаворыць загадчык дома соцкультуры. Кнігі ў нас усе ў адным экземпляры і таму на больш ходкія з іх прыходзіцца запісваць калгаснікаў у чаргу.

Таму зусім не дзіва, што многія кнігі перахадзяць проста з рук у рукі. А на атрыманне некаторых кніг сапраўды запісваюцца ў чаргу калгаснікі.

Для таго, каб мінуць чаргу і хутчэй прачытаць жадаемую кнігу, некаторыя калгаснікі ўхітраюцца часамі браць кнігі, мінуючы бібліятэку. У такім выпадку той, хто ўзяў кнігу ў бібліятэцы, прачытаўшы сам, дае чытаць свайму суседу, які потым варочае яе таму, у кага браў. Такім чынам парушаецца ўстаноўлены бібліятэкай парадак.

І ўсё-ж такі калгасніца Поля Коржыжаноўская з студзеня па чэрвень прачытала Островскага «Как закалялась сталь», Б. Ратасенка «20 дней в контрразведке», К. Апанчэнка «В боях за Перекоп», тры кнігі «Тихий Дон» Шолахава, «80 тысяч верст под водой» і «Дети капитана Гранта» Жуль Верна. Столькі-ж амаль прачытаў кніг калгаснік Хатанка Міхась, Краўчэня, Балышка Леаніх...

А калгаснік Іван Чайка з захапленнем, удумліва чытае Леніна і Сталіна. Ён прачытаў у гэтым годзе Леніна «Что такое «друзья народа» и как они воюют против социал-демократов» і «Что делать?», чытаў «Вопросы ленинизма» Сталіна. Калгаснік Сумар Іван чытае кнігу прафесара Вальфсона «Ідэалогія загніваючага капіталізма».

Усяго ў бібліятэцы каля 500 пастаянных чытачоў.

— Усё такі малавата для нашых калгаснікаў кніг, гаворыць тав. Краўчэня. — Але нічога, хутка папоўніцца наша бібліятэка новымі кнігамі. Выпісалі на 400 рублёў... Крыху грошай даў сельсовет, а крыху адпусціў калгас, вось і набудзем новыя кнігі.

Багат калгасны дом соцкультуры і рознымі газетамі і журналамі. Усяго выпісваецца 15 экземпляраў цэнтральных маскоўскіх і менскіх газет і 28 журналаў.

Усе гэтыя газеты і журналы не ляжаць запыленымі на сталах і шафах, як гэта бывае яшчэ ў некаторых мясцах. Тут яны прачытваюцца калгаснікамі і калгасніцамі. Многія прыходзяць кожны вечар у дом соцкультуры пачытаць свежую газету і журнал, а некаторым даецца на дом пачытаць той ці іншы журнал.

***

З пачатку восені і на працягу ўсёй зімы пры доме соцкультуры калгаса «Прамень комуны» працавала 5 гурткоў.

З наступленнем веснавых работ у полі работа гурткоў значна аслабла. Аднак вайсковы, зоатэхнічны, фізкультурны і драматычны гурткі добра працуюць і зараз. Не гледзячы на тое, што кожны калгаснік і калгасніца заняты былі сяўбой, а зараз заняты па догляду насеваў, удзельнікі вайсковага, фізкультурнага, зоатэхнічнага і драматычнага гурткоў знаходзяць час наведваць заняткі гуртка.

— Асабліва моладзь дый многія старыя цікавяцца вывучэннем вайсковай справы, — адзначае загадчык дома соцкультуры Краўчэня.

Вайсковы гурток мае дробнакаліберныя вінтоўкі і процігазы. Калгасная моладзь аўладала ўжо процігазам, а многія навучыліся нядрэнна страляць, ёсць варашылаўскія стралкі. Калгаснікі заяўляюць:

— Хай толькі папрабуе хто парушыць нашы совецкія граніцы — як адзін выступім на абарону!

— Выступім!.. Для гэтага-ж мы і вывучаем вайсковую справу і вучымся метка страляць.

Даюць станоўчыя вынікі работы і астатнія гурткі. Узяць хоць-бы агратэхнічны гурток. Заняткі гэтага гуртка не прайшлі дарма. Атрыманыя калгаснікамі зімою ў гуртку веды па агратэхніцы прымяняліся ў часе апрапоўкі глебы і сяўбы яравых. Затое ў гэтым калгасе і пасевы яравых выглядаюць куды лепш, чым у суседніх калгасах.

А возьміце драматычны гурток. З восені мінулага года і да паловы мая гэтага года калгасны драмгурток даў 12 пастановак. З вялікай цікавасцю калгаснікі глядзяць свой калгасны тэатр. Шмат старых і моладзі прыязджаюць і прыходзяць з суседніх калгасаў паглядзець пастаноўку драмгуртка сельгасарцелі «Прамень комуны».

***

— Мы ў сваім калгасе не сумуем, нам заўсёды весела.

— У вольны ад работы час у нас ёсць чым заняцца.

— Весела і радасна праводзім мы свой адпачынак.

Так гаворыць калгаснікі сельгасарцелі «Прамень комуны». І гэта так. І зімою і вясной, улетку і ўвосень — заўсёды калгаснікі знаходзяць сабе вясёлы, культурны і радасны адпачынак.

У арганізацыі вясёлага і культурнага адпачынку калгаснікаў вялізарнейшую ролю адыгрывае дом соцкультуры. Радыё, патафон, шашкі, шахматы, більярд. Галосныя чыткі газет і кніг. Кіно. Усё гэта вабіць у дом соцкультуры. Усё гэта стварае для калгаснікаў і калгасніц культурны адпачынак. Ва ўсім гэтым безумоўна вялікая заслуга загадчыка дома соцкультуры — члена партыі Краўчэні Міхаіла Тарасавіча, які аддана, з любоўю выконвае даручаную яму справу.

... Набольш-бы нам такіх дамоў соцкультуры ў калгасную вёску.

С. СЯМАШКА.

Калгас «Прамень комуны», Слуцкага раёна.

Замацаваць за сабою перадавое месца

Вытворчасць лясной промкааперацыі БССР базуецца ў асноўным на мясцовай недэфіцытнай сыравіне. За апошнія гады асвоен і грунтоўна пашыран рад новых промыслаў (бандарны, абручны, спіртапарашковы, карзінаплётны), выраб гаспадарчых прылад (балей, каромыслаў, вёдзер, цэбраў, ручных кошыкаў) і інш.

Прыступілі да вырабу флотаацэйнага масла, якое здабываецца з низкакаснага шкіпінару. Раней гэтае масла ўвозілася з-за граніцы. Асвоена вытворчасць і выпускаюцца ў вялікай колькасці канцэлярскія прылады (ручкі, чарніцы), ватэрпасы для будаўніцтва. Шырока разгорнута вытворчасць плеценай дачнай і дзіцячай мэблі. Адыходы смалакурных заводаў (падсмольнай вады), якія да гэтага часу выліваліся, пераапрацоўваюцца ў воцтавы парашок і спірт.

З адыходаў скурзаводаў, фабрыкі «Пролетарская перамога» і «Камінтэрн» арганізавана вытворчасць валкага клею, дзёгцю і іншых прадуктаў шырокага ўжытку.

Стаханаўскі рух, разгорнуты па ўсёй краіне, выклікаў вялікі вытворчы ўздым сярод членаў арцелей усіх галін нашай сістэмы. Лепшыя стаханаўцы лясной промкааперацыі тт. Чарапаха, Бернштэйн, Артаненка, Клоц, Капусціна, Абрамоўшчык, Коваль першымі паказалі сапраўдныя ўзоры ў асваенні тэхнікі вытворчасці. Яны з'яўляюцца ініцыятарамі пераходу ладу арцелей на суцэльны стаханаўскі метад работ. На 1 мая па ўсёй сістэме налічваецца 3.325 стаханаўцаў.

У 1936 годзе лясная промкааперацыя БССР павінна даць краіне на 93 мільёны 218 тысяч рублёў прадукцыі, рост у параўнанні з 1935 годам складае 16 проц., у тым ліку прадукцыі шырспажыву на 30 мільёнаў 326,7 тысяч рублёў.

У красавіку — месяцы стаханаўскай вучобы — рад арцелей Бабруйска, Менска, Гомеля, Магілева, Оршы далі прадукцыі значна больш, чым у лютым і сакавіку, выканаўшы план на 120—140 проц.

Стаханаўцы арцелі «Дрэваапрацоўшчык» (Менск) тав. Пікус і Мацкевіч дабіліся высокіх паказальнікаў на фанероўцы тумбачных шафаў, выконваючы свае нормы на 506 проц. Абойшчык Вольман—на 481 проц. Стаханаўцы арцелі «Чырвоны Клетчавік» (Чэрвень) Мякота, Тоўсцік Алесь, Якубовіч, Каган сістэматычна даюць 230—250 проц. нормы. Стаханаўцы арцелі «1 мая» (аршанскі лесдрэўхімсаюз) дабіліся выхаду з аднаго кубаметра асмолу 28 кілограмаў шкіпінару замест ранейшых 16 кілограмаў.

Спіртапарашковыя заводы «Кораб», «Амела», арцель «Аб'яднанне», «Камень» імя Сталіна (Барысаў) «Новасёлкі», «Узнес» (Рэчыца) дабіліся выхаду з аднаго кубаметра кураных дроў 13,5 кілограма спірту.

Многія члены арцелі ўнеслі рацыяналізатарскія прапановы, якія далі эканоміі дзесяткі тысяч рублёў. Майстар машыннага цэха арцелі «Трудмебель» тав. Сухаропак устанавіў варштат для рэзкі шыпаў, які дае эканоміі да 30 тысяч рублёў у год. Каштуе гэты варштат усяго 500 руб. Стаханавец Кармянскага спіртапарашковага завода (Мазыр) тав. Бэн пераканструяваў абмуроўку казанаў (3 казаны абагріваюцца двума топкамі), што дало эканоміі да 40 тысяч руб. у год.

Аднак, не ўсе лесдрэўхімсаюзы за апошняга часу зразумелі палітычную важнасць справы разгортвання стаханаўскага руху. Па прыкладу, мазырскаму, слуцкаму, барысаўскаму саюзах рост стаханаўцаў спынуўся. Гэтыя саюзы выконваюць свой план на 70—85 проц. Арцелі «Чырвоны хімік» (Ельск), імя Варашылава, «1-е мая» (Барысаў), імя Крупскай (Гомель), «Хімік» (Слуцак) і інш. сістэматычна не выконваюць сваіх планаў (на 50—70 проц.). Кіраўнікі гэтых арцелей апынуліся ў абозе стаханаўскага руху.

Па арцелі «1-мая» (Чэрвень, старшыня Ткачэрскі) ёсць факты апашлення стаханаўскага руху. Тут ёсць вялікая запазычанасць па зарплаце членам арцелі. Аб гэтым зусім правільна і своечасова сігналізавала «Звязда». Кіраўніцтва менскага лесдрэўхімсаюза (старшыня Фарбер) толькі зараз збіраецца прыняць захады да палаштання станоўішча арцелі ў той час, калі тав. Фарберу даўно вядомы справы гэтай арцелі.

Прэзідыум Белкалеспрамсаюза прыняў тэрміновыя захады, рэагуючы на карэспандэнцыю, змешчаную у «Звяздзе». Поўнасцю ліквідавана запазычанасць па зарплаце. Для прыняцця мер па знішчэнню недахопаў і аказання канкрэтнай дапамогі ў разгортванні стаханаўскага руху накіраван у арцель член прэзідыума тав. Ройзін.

Рашэннем 3 пленума Белкалеспрамсаюза пераходны сцяг прысуджан бабруйскаму лесдрэўхімсаюзу, які ідзе ўперадзе па ўсёй сістэме.

Пленум намеціў рад канкрэтных мерапрыемстваў па шырокаму ахопу тэхнічнай вучобай усіх членаў арцелі. У дапамогу адстаючым арцелям прэзідыум пасылае адказных работнікаў, а таксама надзяляе абаротнымі сродкамі.

У адказ на пісьмо бабруйскіх калгаснікаў аб дастойнай сустрэчы XVI гадавіны вызвалення Беларусі ад белапалякаў, стаханаўцы арцелей, інжынерна-тэхнічныя работнікі сістэмы Белкалеспрамсаюза абавязаліся выканаць поўгадовы план да 5 чэрвеня, а гадавую праграму да XIX гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

За ўзорную работу наша сістэма атрымала ў 1934 г. высокую ганаровую ацэнку—пераходны сцяг ЦК КП(б)Б і Соўнаркома БССР і Усекалеспрамсаюза. За датэрміновае выкананне вытворчай праграмы 1935 г. мы ўтрымалі за сабою пераходны сцяг. Рашэннем 5 пленума Усекалеспрамсаюза ён пакінут за намі і на 1936 год.

ВАЎЧОК.

ГРАНДЫЁЗНЫ МІТЫНГ НАРОДНАГА ФРОНТА Ў ПАРЫЖЫ

ВЫСТУПЛЕННЕ ТАВ. ТОРЭЗА

ПАРЫЖ, 8 чэрвеня. (БЕЛТА). Учора сацыялістычнай партыяй на зімовым веладроме быў арганізован грандыёзны мітынг у азнаменаванне перамогі народнага фронта на выбарах. Мітынг, у якім прымала ўдзел некалькі дзесяткаў тысяч чалавек (многія не папалі ў сярэдзіну памяшкання і слухалі на вуліцы пад нясцішным дажджом прамовы, якія перадавалися гучнагаварыцелямі), прайшоў з велізарным уздымам.

Побач з кіраўнікамі сацыялістычнай партыі Блюмам, Форам і інш. выступіў таксама генеральны сакратар компартыі **Торэз**, спатканы авацыямі і спевам «Інтэрнацыянала».

Торэз заявіў: «Я перадаю вам брацкае прывітанне ад імя компартыі. Мы загадзя радуемся першым мерам грамадскага выратавання, прадпрынятым урадам на чале з Леонам Блюмам. Мы пераконаны, што, апіраючыся на 380 дэпутатаў народнага фронта, карыстаючыся падтрыманнем мас, урад, якога хапеў народ, ажыццёвіць народную волю».

Далей Торэз успамінае, як два гады назад зараджаўся адзіны пролетарскі фронт ва Францыі і ўсклікае:

«Які шлях пройдзен з таго часу! **Мы, комуністы і сацыялісты, звязаны неразрыўным пактам аб адзінстве дзеянняў (авацыя).** Аб'яднаному рабочаму класу ўдалося ўцягнуць за сабой сярэдні клас і выкаваць народны фронт. Злучаныя сілы працы і дэмакратыі атрымалі перамогу. Заўтра яны забяспечаць выратаванне краіны».

Даўшы затым агляд барацьбы народных мас пасля лютаўскіх падзей 1934 года, Торэз падкрэсліў: «Паўшыя ў лютым падпісалі сваёй кроўю словы, з якімі выступае наш народ: **«Фашызм не пераможа!» (Гром апладысментаў).**

Новая бура апладысментаў уздымаецца, калі Торэз вітае забастовачную барацьбу французскіх рабочых. Забастовачны рух — гаворыць далей Торэз — ёсць эпізод той барацьбы за хлеб, якую вялі народны фронт. Барацьба за хлеб заключаецца яшчэ ў тым каб прымусіць плаціць багатых, як гэтага патрабуе наша партыя.

Торэз гаворыць далей аб барацьбе за мір, уключанай у праграму народнага фронта, за мір якому пагражае фашызм. Пры гэтым Торэз кідае лозунг: **«Усё для народнага фронта і праз народны фронт!».**

Торэз заяўляе, што комуністы пастанавілі ва што-б там ні стала забяспечыць поспех народнага фронта.

«Мы, комуністы, пераконаны, што патрэбуецца поўнае сацыяльнае пераўтварэнне, і думаем, што для гэтага пераўтварэння патрэбуецца ўлада советаў **(апладысменты).** Аднак у сучасны момант мы аб'ядналіся ў народным фронце для ажыццяўлення паўнай, яснай і дакладнай праграмы. Будзем яшчэ больш мацаваць народны фронт, разгорнем сетку камітэтаў народнага фронта і паскорым справу стварэння адзінай партыі пролетарыята!».

Пад бурныя авацыі ўсёй залы Торэз заканчвае: **«Усе разам пойдзем наперад да свабоднай, магутнай і шчаслівай Францыі, якую мы хочам і якую мы створым!».**

На мітынгу выступіў кіраўнік урада **Леон Блюм,** які падкрэсліў, наколькі давер'е і падтрыманне мас неабходны новаму ўраду для выражэння яго задач. Затым Блюм кароткa ахарактарызаваў ход перагавораў па ўрэгуляванню забастовачных канфліктаў. У заключэнне Блюм заявіў, што ўрад будзе чэрпаць неабходную сілу ў давер'і народных мас. Сканчэнне яго прамовы пакрываецца спевам «Інтэрнацыянала» і воклічамі: «Няхай жыве народны фронт!».

МАГУТНЫ УЗДЫМ ЗАБАСТОВАЧНАГА РУХУ ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Учора ў прамысловых раёнах паўночнай Францыі баставала, паводле даных «Юманіта», каля 400 тысяч чалавек. З іх 150 тыс. — гарнякі дэпартамента Нор і Па-дэ-Кале. Забастоўка гарнякоў насіла ўсеагульны характар. Учора-ж у міністэрстве працы было дасягнута пагадненне аб задаволенні патрабаванняў гарнякоў. Гэта пагадненне па свайму зместу аналагічна агульнаму пагадненню, дасягнутаму пры пасрэдніцтве прэм'ера Блюма.

Забастоўка будаўнікоў Парыжскага раёна насіла ўчора ўсеагульны характар. 25 тысяч парыжскіх землякопаў (адна з катэгорый будаўнікоў) дабілася павелічэння падзённай зарплаты на 8—10 франкаў у дзень. Буйныя магазіны Парыжа прадаўжаюць баставаць.

Муніцыпальны совет Парыжа адпусціў 500 тыс. франкаў на дапамогу сем'ям бастуючых. Гэтага патрабавалі комуністы і сацыялісты, якія прадстаўляюць, як вядома, меншасць муніцыпальнага совета. Рэакцыйная большасць не адважылася галасаваць супроць.

Федэрацыя чыгуначнікаў высунула рад патрабаванняў у тым ліку: адмену надзвычайных дэкратаў і аднаўленне сістэмы аплаты працы, існаваўшай да першага студзеня 1934 года; неадкладнае і паўсямеснае прымяненне 8-гадзіннага рабочага дня аж да ўвядзення 40-гадзіннага рабочага тыдню і інш.

Каменшчыкі становішча, адзін з сакратароў усеагульнай канфедэрацыі працы Фрашон піша ў «Юманіта»:

«Вялікая бітва, якая пачалася 15 дзён таму назад, прывяла да агульнага павелічэння зарплаты на 7—15 проц. для 8 мільёнаў працаўнікоў нашай краіны. На працягу доўгіх год тэрор гаспадароў затрудняў ці рабіў немагчымым для большасці рабочых уступленне ў профсаюзы. У рэзультаце накальніх дзён барацьбы працоўныя змянілі гэтыя парашкоды».

АНТЫЯПОНСКІ РУХ У КІТАІ

ПАЎДНЁВА-ЗАХОДНЯЯ ВАЕННАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ

ШАНХАЙ, 8 чэрвеня. (БЕЛТА). Як паведамляе кантонскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр, наперакор афіцыяльным абвяржэнням, гуансійскія часці занялі Юнчжоу (Чжыцзян) у паўднёва-заходняй частцы правінцыі Хунань.

19 чэрвеня ў Кантоне (правінцыя Гуандун) і ў Наньніне (правінцыя Гуансі) адбудзецца цэрэмонія прыняцця прысягі паўднёва-заходняй антыяпонскай экспедыцыі, у якую ўваходзяць армейскія часці, паветраны і морскі флот. Затым войскі неадкладна пойдуць на поўдзень пад камандай Бай Цзун-сі. Аб'яўлен набор у гуандунскую армію салдат і афіцэраў былой 19-й арміі «для ўмацавання паўднёва-заходняй антыяпонскай экспедыцыі».

Гэтыя салдаты будуць сфармаваны ў асобую часць. «Уключэнне войск 19-й арміі — паясняе карэспандэнт — прыдасць экспедыцыі больш сілы і вагі ў сувязі з доблесным супраціўленнем, якое 19-я армія аказала Японіі ў 1932 годзе ў Шанхаі».

Нанкінскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што «японскі ўрад заявіў нанкінскаму ўраду рашучы пратэст супроць антыяпонскага руху на паўднёвым захадзе Кітая».

***

ШАНХАЙ, 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Кантонскі карэспандэнт Рэйтэр паведамляе, што 8 чэрвеня ў Кантоне была склікана ваенная канферэнцыя для абмеркавання плана паўночнай антыяпонскай экспедыцыі. Пастаноўлена пакуль што абмежавацца ўмацаваннем пазіцый на фронце, а прасоўванне на поўнач пачаць у сярэдзіне чэрвеня. Экспедыцыйныя войскі складаюцца з 50 тысяч адборных войск, якім прыдаюцца 50 самалётаў. Штаб гуансійскай арміі выпусціў зварот, у якім прыводзіцца праграма адзінага антыяпонскага фронта. Гэта праграма, паводле слоў карэспандэнта, зводзіцца к наступнаму:

гуансійскія ўлады неадкладна разрываюць усе адносіны з Японіяй і анулююць усе ўніжаючыя Кітай дагаворы;

супраціўленне Японіі з'яўляецца адзінай мэтай паўночнай экспедыцыі; гуансійскія ўлады супроць грамадзянскай вайны, паколькі яна азначае вайну кітайскіх войск са сваімі суайчыннікамі.

Трэба вітаць усе ўзброеныя сілы Кітая, незалежна ад існуючых паміж імі партыйных разгалоссяў, якія жадаюць прыняць удзел у барацьбе з захватчыкамі.

НОВЫЯ РАССТРЭЛЫ БЕСПРАЦОЎНЫХ У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Як паведамляе «Ілюстраваны кур'ер подзенны», учора ў гор. Торуне (Паморскае ваяводства) у часе разгону дэманстрацыі беспрацоўных паліцыя адкрыла па іх рэвальверны агонь. Забіт сакратар профсаюза лясных і сельскагаспадарчых рабочых Навінкі. Апрача таго, ранены тры дэманстранты; адзін з іх ў больніцы памёр.

«Варшаўскі дзённік народовы» паведамляе, што, апрача твух цяжка раненых, ёсць звыш 10 лёгка раненых беспрацоўных. Ранены каменнямі таксама 4 паліцэйскія. Пасля аднаўлення парадку ў Торуне—піша газета—праведзены масавыя арышты. Па гораду разъязджаюць узмоцненыя паліцэйскія нарады.

БАЛЕТНЫЯ ГУРТКІ Ў СОЎГАСАХ І КАЛГАСАХ

УЗДА, 9 чэрвеня. (Кар. «Звязды»). На ўсесаюзнай алімпіядзе самадзейнага мастацтва прамысловай кааперацыі комсамолкі-балерыны Ерамеева і Мінькова з шавецкай арцелі «Эканомія» занялі другое месца. Арцель атрымала прэмію — раяль для клуба.

Балетнае самадзейнае мастацтва развіваецца ў соўгасах і калгасах раёна. У соўгасе «Кухцічы» ў балетным гуртку займаецца многа маладых работніц. Арганізован гурток у калгасе імя Сталіна, Магільнянскага сельсовета. Калгасніца Пешкевіч праяўляе вялікія здольнасці ў балеце.

КАНІФОЛЬНЫ ЗАВОД ПАЧАЎ ПЕРААПРАЦОЎКУ ЖЫВІЦЫ

БАРЫСАЎ, 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Закончаны работы па пераабсталяванню і пашырэнню барысаўскага каніфольнага завода. Асноўны хімічны цэх пераведзен у новы каменны будынак і абсталёван навейшай апаратурай, што дасць магчымасць сёлета павялічыць пераапрацоўку смалы-жывіцы да 25 тон у суткі замест леташніх 12 тон. Завод за год дасць прадукцыі на 5 млн. рублёў.

5 чэрвеня распачата работа па пераапрацоўцы жывіцы. З 15 чэрвеня пры заводзе адкрываецца новы цэх тыпсапжыву па вырабу машыннага масла і аліфы.

КАЛГАСНІЦА ПІТОВА НАРАДЗІЛА ДВАЙНЮ

Аршанская раённая газета «Ленінскі прызыў» паведамляе, што чыцідзесяцігадовая калгасніца Пітова з калгаса імя Сталіна, Якаўлевіцкага сельсовета, нарадзіла двайню — хлопчыка і дзяўчынку. Пітова нарадзіла ўжо дзесяць дзяцей. Старэйшыя два сыны ў Чырвонай арміі. Раённы аддзел аховы здароўя аказаў Пітовай матэрыяльную дапамогу.

ЛАГЕРЫ, САНАТОРЫІ, ПЛЯЦОЎКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

У БССР пачалася летняя аздараўленчая дзіцячая кампанія. Тысячы окцябрат вывезены за горад у дачныя мясцовасці. У сувязі з набліжэннем сканчэння навучальнага года рыхтуецца масавы выезд піонераў і школьнікаў. Наркомасветы і Наркамат аховы здароўя арганізуюць па БССР 165 піонерскіх санаторных лагераў і санаторных пляцовак, якія абслужаць не менш 60 тысяч дзяцей. Ствараецца шырокая сетка школьных пляцовак для дзяцей, якія застануцца на лета ў горадзе. У Менску, Гомелі, Магілеве і Бабруйску адкрываюцца дашкольныя здраўніцы. На правядзенне летняй дзіцячай аздараўленчай кампаніі асігнавана каля 4 з палавай мільёнаў руб.

ГАНДЛЕВАЯ ХРОНІКА

З 11 чэрвеня зніжаецца цана на махорку. Пачка махоркі будзе каштаваць 35 кап. замест ранейшых 50 кап.

ПЕРАМОЖЦЫ МІЖНАРОДНАГА ШАХМАТНАГА ТУРНІРУ Ў МАСКВЕ

Экс-чэмпіён свету Х. Р. КАПАБЛАНКА

Чэмпіён СССР гросмайстар М. БАТВІНІК

ТРЭЦІ МАСКОЎСКІ МІЖНАРОДНЫ ШАХМАТНЫ ТУРНІР

На першых месцах Капабланка і Батвінік

Пасля перапынку Капабланка выйграў у Эліскасеса. Партыя Левенфіш—Батвінік закончылася ўнічыю.

Рэзультаты турніру: на першым месцы Капабланка — 13 ачкоў; на другім Батвінік — 12 ачкоў; на трэцім Флор — 9,5; на чацвертым Ліліенталь — 9; на пятым Рагозін — 8,5.

Першыя 5 месц лічацца прызавымі. За мяжой прызераў: на шостым месцы Ласкер — 8 ачкоў; сёмае, восьмае, дзевятае і дзесятае месцы падзялілі Румін, Левенфіш, Кан і Эліскасез.

ПРАДСВЯТОЧНЫ КУЛЬТУРНЫ ПАХОД КАЛГАСНІКАЎ

СЛУЦАК, 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Набліжаецца вялікае ўсенароднае свята. Па ініцыятыве стаханаўцаў у калгасе «Чырвоны бор», Слуцкага раёна, пачаўся прадсвяточны культурны паход. Да свята будуць адрамантаваны ўсе дарогі мясцовага значэння, зроблены новыя масты. Вуліцы і двары будуць абгароджаны новымі платамі і насыпаны жоўтым пяском. Калгасныя хаты будуць пабелены і абклеены шпалерамі. Калгаснікі абавязаліся даабсталяваць і прывесці ва ўзорны культурны выгляд сваю хату-чытальню, яслі і пляцоўкі. Стаханаўцы калгаса звярнуліся з пісьмом да ўсіх калгаснікаў і працоўных округі з заклікам разгарнуць прадсвяточны культурны паход.

УСЕБЕЛАРУСКІЯ СТРАЛКОВЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ РАБОЧЫХ ГАРОДНЫХ СОЎГАСАЎ

З 8 да 22 чэрвеня па ўсіх гародных соўгасах рэспублікі праводзяцца стралковыя спаборніцтвы. Пераможцы ўнутрысоўгасных спаборніцтваў будуць прымаць удзел ва ўсебеларускіх стралковых спаборніцтвах рабочых гародных соўгасаў, якія намечана правесці 27—28 чэрвеня ў бабруйскім соўгасе Белхарчгандля. Ва ўсебеларускіх стралковых спаборніцтвах прымуць удзел 40 чал.

ВЫЙГРЫШ У 1.000 РУБ.

9 чэрвеня ў цэнтральную ашчадкасу № 16 у Менску з'явіўся вучань 13-й школы В. М. Рачкоў і прад'явіў білет № 063 серыі № 19629, 10-й латарэі Асоавіяхіма, на які выпаў выйгрыш у 1.000 руб.

МАРОЖАНАЕ

За сакавік, красавік і май у Менску прадана 52.315 кілограмаў марожанага. У мінулым годзе за гэтыя-ж тры месяцы было прадана толькі 14.500 кілограмаў.

Малочны завод пачаў выпускаць вельмі прыемнае на смак фасаванае марожанае пачкамі вагой у 40 і 80 грамаў. Яно прадаецца ў павільёне малочнага камбіната ў садзе «Профінтэрн» і ў магазіне Маслапрома на Ленінскай вуліцы.

Аднак гандаль марожаным арганізован покуль што нездавальняюча. Прадаўцы не заўсёды чыста апранутыя, а выгляд рук некаторых прадаўцоў можа пазбавіць апетыту самага непатрабавальнага пакупніка. Марожанае, як правіла, атрымліваецца значна менш нормы. Зусім няўдала падабраны многія месцы для продажу марожанага. Цялежкі стаяць у цёмных і брудных брамах, у завулках і іншых неадпаведных месцах.

Пленум Менгаркома КП(б)Б, назначаны на 11 чэрвеня, пераносіцца на 13 чэрвеня, на 6 гадзін вечара. Пленум адбудзецца ў Доме партактыва (малая зала).

Сакратар менгаркома КП(б)Б РЫСКІН.

ПРЫЕМ У ВКІП

Аддзел школ і навукі ЦК КП(б)Б паведамляе, што ёсць месцы для паступлення ў Вышэйшы комуністычны інстытут асветы (ВКІП) у Маскве, які рыхтуе кіруючых работнікаў органаў народнай асветы, педагагічных ВНУ, навуковых работнікаў і выкладчыкаў педагагічных дысцыплін пед. ВНУ.

У ВКІП прымаюцца члены партыі са стажам не менш 5 год, якія скончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы, або ўладаюць ведамі ў аб'ёме ВНУ, маюць педагагічны вопыт і стаж кіруючай партыйнай, комсамольскай, совецкай, профсаюзнай і іншай грамадскай работы. Асобы, якія маюць вялікі педагагічны стаж, прымаюцца ў інстытут пры адсутнасці стажу кіруючай работы.

Узрост паступаючых — не старэй 35 год. Прынятыя ў лік слухачоў забяспечваюцца стыпендыяй ад 250 да 350 руб.

Жадаючыя паступіць у ВКІП могуць азнаёміцца з падрабязнымі ўмовамі прыёму ў аддзеле школ і навукі ЦК КП(б)Б, а таксама ва ўсіх АК, ГК і РК КП(б)Б.

Заявы аб паступленні разам з патрабуемымі дакументамі падаюцца ў ГК, РК КП(б)Б, а ў выпадку адмаўлення з боку ГК, РК у пасылцы на вучобу ў ВКІП, заявы разам з дакументамі падаюцца непасрэдна ў аддзел школ і навукі ЦК КП(б)Б да 1 ліпеня г. г.

АДДЗЕЛ ШКОЛ І НАВУКІ ЦК КП(б)Б.

АРТЫСТЫ БДТ-І НА СПЛАВЕ

5 чэрвеня брыгада артыстаў 1 Беларускага дзяржаўнага тэатра прыбыла на прыстань Петухоўка, на Дняпры, Магілеўскага раёна. Увечары клуб прыстані запоўнілі 500 сплаўшчыкаў і калгаснікаў, якія з захапленнем глядзелі спектакль «Сваты». 6 чэрвеня брыгада ставіла «Сваты» ў клубе прыстані Лімень, Чэрыкаўскага раёна. На спектакль прыехалі на машынах 300 сплаўшчыкаў і калгаснікаў. Глядачы дзякавалі артыстаў за іх прыезд.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ТЭАТРАЛЬНАЯ НАРАДА

Кіраўніцтва па справах мастацтваў пры СНК БССР склікае 13 чэрвеня ўсебеларускую нараду дырэктароў і мастацкіх кіраўнікоў тэатраў. Нарада разгледзіць пытанні аб рэпертуарным плане да канца 1936 года, аб плане на 1937 год і падрыхтоўцы да 20-годдзя Кастрычніцкай рэволюцыі і да пушкінскіх дзён.

БССР НА ЎСЕСАЮЗНЫМ МУЗЫЧНЫМ ФЕСТЫВАЛІ

У чэрвені ў Маскве адбудзецца ўсесаюзны музычны фестываль студэнтаў кансерваторый. Ад Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя Луначарскага на фестываль паедуць 7 студэнтаў-выдатнікаў — тт. Крос, Руч'ёва (вакалісткі), Берман, Гітліц, Багіна, Цвятаева (піяністы) і Крук (скрыпач).

ЗДАРЭННІ

★ Да адказнасці за збіенне. Чорнарабочы К. Г. Прыстаўка ў Менску сістэматычна збіваў сваю былую жонку Н. І. Казакевіч. 8 чэрвеня ён з'явіўся да яе на кватэру, паламаў рад рэчаў і збіў яе. Хуліган прыцягваецца да судовай адказнасці.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Дзіцячы гукавы кінатэатр — ЛЁТЧЫКІ
«Спартак» — 3-я серыя МІС.МЕНД
«Чырвоная горка» — Чалавек-невідзімка
«Пролетарый» — ЦЫРК
«Інтэрнацыянал» — ПЕРШЫ УЗВОД

Бабруйскі дашкольны педагагічны тэхнікум абвяшчае ПРЫЕМ на першы курс беларускага і рускага аддзяленняў.

Тэхнікум рыхтуе інспектароў па дашкольнай рабоце і работнікаў стацыянарных дашкольных устаноў.

У тэхнікум прымаюцца асобы, якія скончылі НСШ або 7 класаў сярэдняй школы ва ўзросце ад 15 да 35 гадоў.

Паступаючыя ў тэхнікум падаюць заяву на імя дырэктара, прыкладаючы наступныя дакументы:

а) пасведчанне аб нараджэнні (арыгінал);

б) пасведчанне аб адукацыі (арыгінал);

в) пасведчанне лекавай установы аб тым, што стан здароўя паступаючага не перашкаджае паступленню ў педагагічныя тэхнікумы;

г) дзве фотакарткі з уласнаручным подпісам.

Прыём заяў праводзіцца з 10 чэрвеня да 20 жніўня.

Усе паступаючыя павінны трымаць іспыты (з 22 жніўня да 29 жніўня) у аб'ёме праграм бяпоўнай сярэдняй школы па наступных прадметах: беларускай, рускай мовах і матэматыцы (пісьмова і вусна), грамадазнаўству і геаграфіі (вусна).

Прынятыя студэнты забяспечваюцца стыпендыяй па пасяховасці.

Заявы дасылаць па адрасу: Бабруйск, Пушкінская, 62.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Памяшканні БДТ-1 — Ад 11 чэрвеня — гастролі Харкаўскага украінскага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Т. Г. ШЭЎЧЭНКА (б. «Берэзіль»)

РЭПЕРТУАР:

А. КАРНІЙЧУК — Гибель эскадры. | А. КАРНІЙЧУК — Платон Кречет.

М. ГОРКІ — Васса Железнова. | А. АФІНАГЕНАЎ — Портрет. | КАРПЕНКА—КАРЫЙ — Мартын Боруля.

Білеты прадаюцца ў касе тэатра з 12 да 2 і з 5 да 8 г. веч. і ў Доме Урада (I паверх, левае крыло).

ДЫРЭКЦЫЯ БДТ-1.

Магілеўскі дзяржаўны педагагічны інстытут абвяшчае ПРЫЁМ студэнтаў на 1936—37 навучальны год на факультэты: гістарычны, літаратурна-лінгвістычны і геаграфічны

Інстытут рыхтуе выкладчыкаў літаратуры, мовы, гісторыі і геаграфіі для поўнай сярэдняй школы і тэхнікумаў.

У пединстытут прымаюцца асобы па ўзросце ад 17 да 35 гадоў.

Усе асобы, якія паступаюць у МПІ, павінны мець закончаную сярэднюю асвету (сярэдняя школа, тэхнікум, рабфак) або атэстат аб сканчэнні сярэдняй школы ў парадку экстэрната.

Незалежна ад маючайся асветы паступаючыя павінны трымаць іспыты ў аб'ёме курса сярэдняй школы па беларускай і рускай мовах, матэматыцы, фізіцы, хіміі і палітграмаце; паступаючыя на геаграфічны факультэт падлягаюць дадаткова іспытам па геаграфіі.

УВАГА. 1. Скончылушыя дзесяцігодку з адзнакай «выдатна» залічваюцца без іспытаў.

2. Асобы, якія скончылі сярэднюю школу не ў БССР і атрымалі незадавальняючую ацэнку па беларускай мове і літаратуры, могуць быць залічаны ў лік студэнтаў пры ўмове паспяховай здачы імі іспытаў па астатніх прадметах з абавязкам здаць іспыты па беларускай мове і літаратуры да пачатку наступнага навучальнага года.

Заявы падаваць на імя дырэктара з прыкладаннем наступных дакументаў:

а) атэстата аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы, рабфака, тэхнікума (ў арыгінале);

б) пашпарта (прад'яўляецца асабіста);

в) пасведчання ад дзяржаўнай лекавай установы аб тым, што стан здароўя паступаючага не перашкаджае паступленню ў педагагічную ВНУ,

г) двух фотакартак з уласнаручным подпісам на кожнай з іх, засведчаных дзяржаўнай установай;

д) аўтабіяграфіі, у якой паступаючы дае аб сабе наступныя весткі: год і месца нараджэння, нацыянальнасць, грамадзянства, партыйнасць, прыналежнасць да ЛКСМВ, асвета, прафесія, спецыяльнасць, вытворчы стаж, сямейнае становішча, сацыяльнае становішча бацькоў, зарплата паступаючага, а калі ўтрымалец, то заработак бацькоў, адносіны да вайсковай павіннасці.

У заяве трэба ўказаць, які факультэт паступаючы выбірае.

У заяве павінен быць указан дакладны адрас паступаючага. Прыём заяў аб залічэнні праводзіцца з 1 ліпеня да 1 жніўня. Прыёмныя іспыты адбудуцца з 10 да 20 жніўня, залічэнне ў склад студэнтаў — з 20 да 25 жніўня.

Іншагароднія студэнты забяспечваюцца інтэрнатам. Стыпендыя ў залежнасці ад пасяховасці.

Членам сем'яў студэнтаў інтэрнат не прадастаўляецца.

Заявы накіроўваць па адрасу: г. Магілеў, Ленінская, 35, пединстытут.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ДАСТАЎКА ХЛЕБАБУЛАЧНЫХ ВЫРАБАЎ НА ДОМ

У мэтах лепшага абслугоўвання пакупнікоў наступныя магазіны хлебнай канторы Менгархарчгандля ПРЫМАЮЦЬ ЗАКАЗЫ на дастаўку хлебабулачных вырабаў на ДОМ:

магазін № 102 — Суражская, 2, тэл. 25.667;
» № 108 — пр. Совецкай і Свярдлоўскай, тэл. 23.046;
» № 109 — Совецкая, супроць Дома Урада, тэл. 23.968;
» № 129 — 1-я Лекерта, 12, тэл. 23.750;
» № 131 — Ленінская, 42, тэл. 22.472;
» № 132 — Ленінская, 16, тэл. 24.996;
» № 133 — Ленінская, 5, тэл. № 23.861;
» № 135 — Інтэрнацыянальная, 7;
» № 139 — Няміга, 21;
» № 140 — Пр. Комсамольскай і Рэволюцыйнай, тэл. 23.853;
» № 143 — Пр. Энгельса і Совецкай;
» № 165 — Ленінская, № 22, тэл. 25.967;

Прыём заказаў на дастаўку хлеба на дом праводзіцца ў любы час.

ДЫРЭКЦЫЯ ХЛЕБНАЙ КАНТОРЫ МЕНГАРХАРЧГАНДЛЯ.

Беларускі дзяржаўны землеўпарадчы тэхнікум сістэмы НКЗБ (гор. Горкі, БССР) АБВЯШЧАЕ АСЕННІ НАБОР СТУДЭНТАЎ на 1 курс тэхнікума ў ліку 90 чал.

Тэхнікум рыхтуе землеўпарадчыкаў-тапографаў.

У тэхнікум прымаюцца асобы не маладзей 16 і не старэй 30 гадоў. Усе паступаючыя ў абавязковым парадку трымаюць прыёмныя іспыты (па праграме 7-гадовай школы) па матэматыцы, фізіцы, беларускай мове і літаратуры, фізічнай геаграфіі і палітграмаце.

Заявы з дакументамі прымаюцца да 15 жніўня. Іспыты — з 15 да 25 жніўня.

Пачатак заняткаў — 1 верасня.

Да заяў прыкладаюцца дакументы ў арыгіналах: кароткая аўтабіяграфія паступаючага; пасведчанне аб сканчэнні няпоўнай сярэдняй школы; даведка ад дзяржаўнай лекавай установы аб здароўі; метрычная даведка; дзве фотакарткі з уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, засведчаныя дзяржаўнай установай, і марак на 40 кап.

Прыязджаючыя на іспыты павінны мець пры сабе пашпарт.

Студэнты тэхнікума забяспечваюцца інтэрнатам, сталовай і стыпендыяй згодна пастановы СНК СССР, па пасяховасці. — ад 60 да 80 р. у месяц.

Тэрмін навучання ў тэхнікуме — 4 гады.

Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: Горкі, БССР, землеўпарадчы тэхнікум.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Дырэкцыя Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута АБВЯШЧАЕ КОНКУРС на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

1) прафесар фізікі,
2) прафесар або дацэнт методыкі матэматыкі,
3) дацэнт методыкі прыродазнаўства,
4) дацэнт методыкі літаратуры і мовы,
5) дацэнт фізіялогіі і анатоміі чалавека,
6) дацэнт беларускай літаратуры.

Навуковыя работнікі, жадаючыя прымаць удзел у конкурсе, абавязаны прадставіць аўтабіяграфічную даведку, дакументы: даведку аб заняцці ў вучоным званні, даведку з апошняга месца работы, працоўны спіс і друкаваныя навуковыя працы.

Інстытут забяспечвае кватэрай, персанальным акладам, па эгодзе, і выдаткі па пераезду.

Заявы накіроўваць: г. Гомель, Пролетарская, 2, пединстытут.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Смальянскі тэхнікум паляводства абвяшчае ПРЫЕМ студэнтаў НА 1936—37 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД У КОЛЬКАСЦІ 90 ЧАЛАВЕК.

Тэхнікум рыхтуе спецыялістаў агранамаў-паляводаў сярэдняй кваліфікацыі са спецыялізацыяй на апошнім курсе па насенняводству.

Тэрмін навучання 4 гады.

У тэхнікум прымаюцца скончылушыя сямігодку ці з ведамі ў аб'ёме сямігодкі ва ўзросце ад 16 да 30 год. Прыём заяў — з 1 чэрвеня па 15 жніўня 1936 года. Да заявы трэба прыкласці наступныя дакументы: кароткую аўтабіяграфію, пасведчанне аб сканчэнні няпоўнай сярэдняй школы (абавязкова арыгінал), даведку аб становішчы здароўя, аб годзе нараджэння, дзве фотакарткі, засведчаныя дзяржаўнай установай.

Прыёмныя іспыты ў аб'ёме няпоўнай сярэдняй школы па матэматыцы, фізіцы, беларускай мове і літаратуры, фізічнай геаграфіі і палітграмаце — з 15 па 25 жніўня 1936 года. Заняткі з 1 верасня.

Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй у размеры 60—90 руб., у залежнасці ад пасяховасці і курса, інтэрнатам, пральняй і лазняй. Пры тэхнікуме ёсць вучэбная ферма, якая забяспечвае правядзенне вучэбна-вытворчай практыкі.

Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: П/А Смальяны, Аршанскага раёна, тэхнікум, чыгуначная станцыя Смальяны.

ДЫРЭКЦЫЯ ТЭХНІКУМА.

Магілеўскі беларускі педагагічны тэхнікум абвяшчае АСЕННІ НАБОР СТУДЭНТАЎ.

Будзе прынята 300 чал.

Прымаюцца асобы ва ўзросце ад 15 да 25 год, якія скончылі НСШ. Студэнты забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй па пасяховасці.

Тэхнікум рыхтуе настаўнікаў пачатковых школ. Лепшая частка выпускнікоў рэкамендуецца для НСШ.

Паступаючыя трымаюць іспыты па гісторыі, матэматыцы, мове — беларускай і рускай і геаграфіі.

Для паступлення неабходна падаць дакументы:

атэстат аб сканчэнні НСШ (арыгінал);
заваеную анкету;
метрыку;
даведку аб здароўі;
дзве фотакарткі і марак на 40 кап.

Аб часе іспытаў паступаючыя будуць паведамлены дадаткова.

Адрас: г. Магілеў, БССР, Быхаўская, 18, магілеўскі Белпедтэхнікум, прыймовай камісіі.

АДМІНІСТРАЦЫЯ.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

Тыраж 90550 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Уп. Галоўлітбела № К — 105